Першаму ўсесаюзнаму зьезду польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў--бальшавіцкае прывітаньне

Pierwszemu Wszechzwiązkowemu Zjazdowi Polskich Pisarzy Proletarjackich-bolszewickie pozdrowienie

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня

Штодзённая газэта

СЯТАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК 17 жніўня 1931 г. № 189 (3278)

Гарачае прывітаньне

Барацьбітом за польскую—сацыялістычную па зьместу і нацыянальную па форме—літаратуру, стойкім дазорам літаратурнай думкі польскіх працоўных мас—удзельнікам Усесаюзнага зьезду польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў—бальшавіцкае прывітаньне.

Таварышы пісьменьнікі! Ваш Зьезд распачынае сваю працу на мяжы дзьвюх сьветаў, на мяжы дзьвюх процілеглых сыстэм—капіталістычнай, арганізм якой з кожным днём у ліхарадцы гаспадарчага крызісу трухлее і адмірае свае апошнія дні, і сацыялістычнай—арганізм якой у поўным росквіце сацыялістычнага будаўніцтва, арганізм якой сваім існаваньнем расхалыхвае мора рэвалюцыйнай барацьбы працоўных усяго сьвету.

Таварышы пісьменьнікі! рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» заклікае Вас ліквідаваць адставаньне ў польскай пралетарскай літаратуры; заклікае да стварэньня буйных твораў, якія ішлі-б побач з бурнымі тэмпамі будаўніцтва сацыялізму, якія-б сваім мастацкім словам, вобразным словам па баявому штурхамі працоўных на хутчэйшае выкананьне прамфінплянаў гістарычнай пяцігодкі.

Няхай жыве Ленінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве і разьвіваецца польская літаратура нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу!

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва, правільная палітыка якой забясьпечвае эканамічны і культурны росквіт усіх народаў СССР.

«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Bojownikom za stworzenie polskiej nacjonalnej po formie i socjalistycznej po treści literatury, twardym dozoram myśli literackie polskich mas pracujących—uczęstnikam Wszechźwiązkowego żjazdu Polskich Pisarzy Proletarjackich—bolszewickie pozdrowienia.

Towarzysze Pisarzy! Wasz zjazd zaczyna swoją pracę na granicy dwuch światów, na granicy dwuch przecileglych systemów—kapitalistycznego, organizm którego z każdym dniem w lichoradcy kryzysu gospodarczego truchleje i odżywa swoje ostatnie dni, i socjalistycznego—organizm którego w pełnym rozkwicie budownictwa socjalistycznego, organizm którego swoim istnieniem podejmu.e może walki rewolucyjnej mas pracujących całego światu.

Towarzysze Pisarze! redakcja gazety „Sowieckaja Biełaruś" wzywa was likwidować odstawanie w polskiej literaturze proletarjackiej, wzywa do stworzenia wielkich tworów, jakie szłyby razem z burnemi tempami budownictwa socjalizmu, jakie-by swoim literackim słowem, malowniczym słowem bojowie natchniali pracujących na prędsze wykonanie promfinplanu historycznej pięciolatki.

Niech żyje nacpolityka Leninowska!

Niech żyje i wzwija się polska literatura nacjonalna po formie i socjalistyczna po treści!

Niech żyje Partja komunistyczna—kierownik i organizator budownictwa socjalistycznego, prawidłowa polityka której zabespiecza ekonomiczny i kulturalny roskwit wszystkim narodam ZSSR!

„Sowieckaja Biełaruś".

Перамога ленінскай нацпалітыкі

Сёньня ў Менску адкрываецца першы зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў. Гэты зьезд зьяўляецца яшчэ адной ілюстрацыяй правільнай нацпалітыкі ленінскай партыі, доказам таго, што толькі савецкая ўлада, толькі дыктатура пралетарыяту можа рашыць і вырашыла нацыянальнае пытаньне.

Раней, у былой царскай Расіі—тюрма народаў—польская літаратура, польская мова прасьледвалася таксама і іншых народаў. Чорная сотня пад тым правазілла русіфікацыю, пачала ўсякае праяўленьне нацыянальнага і культурнага адраджэньня народнасьцяй былой царскай Расіі.

Цяпер, у Савецкім Саюзе, усе нацыянальнасьці, усе народы разьвіваюцца хуткім тэмпам як эканамічна, так і культурна. Расьце і мацнее пралетарская літаратура нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу. Сотні тысяч рабочых-ударнікаў уліваюцца ў літаратуру, тысячы рабкораў уступаюць у баявы атрад пралетарскіх пісьменьнікаў.

Першы зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў мае вялікае палітычнае значэньне. Ён падагуліць тыя вялізарнейшыя дасягненьні, якія маюць рабочыя і калгасьнікі-палякі на тэрыторыі СССР на літаратурным фронце, ён намеціць далейшыя шляхі разьвіцьця пралетарскай літаратуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместе.

Задачай пралетарскіх пісьменьнікаў-палякаў, як і ўсіх пралетарскіх пісьменьнікаў СССР, зьяўляецца рэвільна, па-марксыцку, па-ленінску абіць, у мастацкай форме паказаць ранцкі рост нашага сацыялістычнага будаўніцтва, правільна паказаць нсавую барацьбу і ў горадзе і на вёсцы. Яшчэ больш завострыць барацьбу супроць усякіх варожых літаратурных плыняў.

Рабочыя і калгасьнікі-палякі на тэрыторыі СССР дамагліся вялізарнейшых перамог. Яны разам з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу зьяўляюцца актыўнымі будаўнікамі сацыялізму, актыўнымі барацьбітамі за генэральную лінію партыі, за пяцігодку ў 4 гады. Правільная ленінская нацпалітыка, якую праводзіць наша партыя і ўрад, забясьпечыла магутны рост і культурнага будаўніцтва пралетарыят нашага сацыялістычнага ўсіх нацменшасьцяй. Цэлы рад вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, якія рыхтуюць пралетарскія кадры для работы сярод рабочых, калгасьнікаў і адначасоблікаў-палякаў. Шырокая сетка пачатковых нацыянальных польскіх школ, якіх, бадай поўнасьцю, ахоплены дзеці ўсіх працоўных-палякаў, бібліятэкі, нацыянальныя польскія клюбы, нацыянальны польскі тэатр і цэлы рад іншых культурных устаноў—усё гэта сьведчыць аб перамозе ленінізму, аб перамозе камуністычнай партыі.

Гэтыя посьпехі бурнага росту сацыялістычнага будаўніцтва і вялізарнейшых дасягненьняў на фронце культуры і літаратуры асабліва яскравы, асабліва моцна выпукляюцца, калі мы зьвернем увагу на гаспадарчы развал і культурны заняпад у фашыцкай Польшчы. Фашыцкая Польшча перажывае вострыя эканамічны крызіс, які руйнуе ўсю гаспадарку, набліжае яе да катастрофы, да канчатковага развалу.

Нацыянальная палітыка польскага фашызму—гэта карныя атрады на Заходняй Украіне і на Заходняй Беларусі, гэта «пацыфікацыя», крывавае ўціхамірваньне. Агнём і мячом спусташаюцца вёскі і мястэчкі. Школы нацыянальных меншасьцяў—беларусаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў,—поўнасьцю зьнішчаны, растоптаны ботам фашыцкай дыктатуры. Досыць адзначыць, што на Заходняй Беларусі няма ніводнай беларускай першапачатковай школы, што бацькоў і вучняў, якія патрабавалі беларускай школы, высылаюць на доўгія гады ў катаргу. Зусім, цалкам ліквідаваны беларускі рабоча-сялянскі друк. Ніводнай газэты, ніводнай кніжкі ня могуць выдаць працоўныя нацменшасьці, ніводнай газэты і ніводнай кніжкі ня могуць выдаць і рабочыя ў карэннай Польшчы.

Дыктатура буржуазіі, дыктатура тэрору, бізуна, расстрэлаў, катаргі закавала ланцугамі паліцэйскай цэнзуры пралетарскае друкаванае слова. Рабочая кляса і працоўныя масы ня маюць ніякай магчымасьці мець сваю легальную газэту, ня маюць ніякай магчымасьці мець сваю друкаваную кніжку. Але пры ўсіх стараннях фашыцкай дыктатуры зусім пазбавіць пралетарыят духоўных запатрабаваньняў, зусім пазбавіць яго пралетарскай літаратуры і жывіць толькі свацкай фашыцка-клерыкальнай атрутай,—ім гэта не ўдалося.

Камуністычная партыя Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў глыбокім падпольлі выдае нелегальныя газэты, і пралетарыят і працоўныя маюць сваю газэту, якая арганізуе і мабілізуе масы на барацьбу за штодзённыя запатрабаваньні рабочае клясы, за палепшаньне ўзроўню яе жыцьця, на барацьбу з фашыцкай дыктатурай за дыктатуру пралетарыяту.

Нацыянальная палітыка польскага фашызму—гэта палітыка тэрору, палітыка прычнечаньня, дзікай каленіяльнай эксплёатацыі працоўных мас, прымусовае апалячваньне, канчатковае зруйнаваньне, зьнішчэньне ўсіх школ і культурных устаноў нацменшасьцяў (разгром т-ва Беларускай школы і інш.). Беларускія нацыянал-фашысты—Луцкевіч, Астроўскі і К°, гэтыя агенты польскай ахранкі, актыўна дапамагаюць польскаму фашызму зьнішчаць беларускія рабоча-сялянскія культасьветныя арганізацыі. Беларускія нацыянал-фашысты зьяўляюцца застрэльшчыкамі, ярымі дапаможнікамі польскага фашызму ў падрыхтоўцы да вайны супроць СССР.

Пралетарыят Польшчы і працоўныя масы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ведаюць аб тых вялізарнейшых дасягненьнях, якіх дамогся пралетарыят Савецкага Саюзу. Яны добра ведаюць, што толькі ў краіне Саветаў ідзе бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва, што толькі пралетарская рэвалюцыя і дыктатура пралетарыяту канчаткова назаўсёды зьнішчыла путы сацыяльнай і нацыянальнай няволі. Таму яны, пралетары і ўсе працоўныя Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, як і пралетары ўсяго сьвету, лічаць СССР сваёй бацькаўшчыны, таму выступаюць і актыўна змагаюцца супроць падрыхтоўкі інтэрвэнцыі, у абарону СССР.

Першаму зьезду польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў, баявому атраду на літаратурным фронце барацьбітоў за сацыялістычнае будаўніцтва, за сусьветны Кастрычнік гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА БАЛЬШАВІЗМА

Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў шле шчырае брацкае прывітаньне Усесаюзнаму зьезду польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў і жадае яму плённай працы па замацаваньні далейшага росту і росквіту польскай пралетарскай літаратуры. Самы зьезд—фактар выключнага палітычнага значэньня. Толькі ў краіне саветаў, толькі ў краіне дыктатуры пралетарыяту магчымы гэты зьезд—зьезд творцаў літаратуры, нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьместе, літаратуры інтэрнацыянальнага пралетарскага адзінства, літаратуры, перад якой стаяць складаныя задачы—выяўляць практыку клясы, будуючай сацыялізм, дапамагаць у справе будаўніцтва польскай пралетарскай культуры і ўсямерна дапамагаць сваім зарубежным братом—польскім працоўным у іх жорсткай крывавай барацьбе з польскім фашызмам.

Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў выказвае ўпэўненасьць, што зьезд поўнасьцю справіцца з асноўнай задачай—барацьбой за ленінскі этап пралетарскай літаратуры, за рашучае набліжэньне літаратуры да першачарговых, штодзённых задач сацыялістычнага будаўніцтва, з барацьбой за сапраўднае вялікае мастацтва бальшавізма і тым самым пакладзе моцную цагліну ў фундамант магутнай і непераможнай культуры бальшавізму, перад якой зьнікнуць, растануць крывавыя здані драпежнай, струхнелай культуры буржуазіі.

Няхай жыве непераможнае інтэрнацыянальнае адзінства!

Няхай жыве польская пралетарская культура!

Няхай жыве сапраўднае мастацтва бальшавізма!

Сакратарыят Белапп'у:

Міхась Лінькоў,

Андрэй Александровіч,

Л. Бэндэ.

„Орка"--Зьезду

Рэдакцыя газэты «Орка» шле гарачае бальшавіцкае прывітаньне Усесаюзнаму зьезду польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў.

Першы Зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў зьяўляецца найяскравейшым довадам таго, што толькі ў Савецкім Саюзе пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі зьяўляецца магчымым росквіт пралетарскай культуры ўсіх нацыянальнасьцяй.

Зьезд адбываецца ў пэрыяд калі ў краі, дзе будуецца сацыялізм пускаюцца ў рух найбольшыя волаты сацыялістычнай прамысловасьці, калі сацыялістычная перабудова вёскі атрымлівае перамогу сусьветна гістарычнага значэньня, калі хутка ўзрастае матар'яльны і культурны дабрабыт працоўных мас усіх нацыяльнасьцей вялікага Савецкага Саюзу, у пэрыяд, калі капіталістычны сьвет скатваецца ў прапасьць руйнуючага крызісу, які засуджвае на галодную сьмерць дзесяткі мільёнаў працоўных, калі польскі і сусьветны фашызм імкнецца затаніць у крывавым тэроры ўзрастаючы рэвалюцыйны дух, калі з кожным днём узрастае небясьпека ўзброенага нападу імпэрыялістаў на Савецкі Саюз.

На гэты фоне рашэньні якія будуць прыняты Зьездам польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў у Менску набываюць гістарычнае значэньне.

Польская пралетарская літаратура павінна яшчэ ў большай ступені чымся цяпер узмацніць свой удзел у вялізарным сацыялістычным будаўніцтве, адбіваючы на вялікіх палотнішчах літаратурных твораў гэты вялізарнейшы размах будаўніцтва сацыялізму, арганізуючы ўдзел у гэтым будаўніцтве працоўных мас палякаў, павінна адбіць эпоху выкоўваньня новага чалавека, будаўніка і змагара, адбіць рэвалюцыйную барацьбу пралетарыяту ў фашыцкай Польшчы.

Польская пралетарская літаратура павінна быць пасьбітом энтузіязму і энэргіі працоўных мас палякаў СССР, натхняць западам да барацьбы барацьбітоў за сацыялістычную рэвалюцыю заграніцай.

Польская пралетарская літаратура павінна стаць грозным сродкам выкрыцьця крывавага фашыцкага рэжыму Пілсудзкага, павінна ўзьняць голас протэсту супроць катаваньня палітзьняволеных у казэматах фашыцкай Польшчы, адбіць у творчасьці пропасьць, якая падзяляе Савецкі Саюз і капіталістычны сьвет.

Задачай зьезду ў практычнай галіне ў справе наданьня масавасьці польскаму пралетарскаму літаратурнаму руху ў СССР, у справе наданьня ваяўнічасьці творчасьці і забесьпячэньня яе ўзросту,—будзе практычнае абгаварэньне справы прызыву рабочых ударнікаў і калгасьнікаў у літаратуру, стварэньня моцных пісьменьніцкіх кадраў сярод рабочых і калгасьнікаў.

Мы ўпэўнены, што гэту задачу Зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў здолее выканаць.

РЭДАКЦЫЯ «ОРКІ».

ДЗЬВЕ ДАРОГІ

— Стась, кажу табе, ня ўмееш жыць. Арганізаваў арцель і думаеш, што доўга пратрымаецеся? Не, рассыпецца гэта ўсё. Іншая справа, калі-б кожны з іх працаваў на сябе. На якое ліха табе гэтая арцель? Ня ўмееш жыць. Жыць трэба хітра, браць вось так.—Сымон запусьціў чорныя пальцы ў свой густы чуб, як быццам браў жыцьцё за чуб.

— Кожны, зразумела, жыве інакш, а тое што вам, Сымоне, выдаецца добрым, іншым нічэ нутро.

— Дурны, Стась, раю табе, як чалавеку, ха-ха-ха...

Сымон хітра ўсьміхнуўся і завярнуўся да сябе. Стась з хвіліну стаяў і глядзеў як шырокія, крыху згорбленыя плечы Сымона хісталіся на кароткіх нагах.

— Што там кулак пляце,—падумаў і завярнуў у процілеглы бок.

Сымон з пэўным задаваленьнем прайшоўся некалькі разоў па хаце і затрымаўся на хвілінку пры вакне. Перад ім у бляску заходзячага сонца залаціліся грубыя шулы новага паркану. Далей ўзрок мімаволі падаў на цяжкі, крыху іржавы замок, які вісеў на дзьвярах сьвірна з поўнымі засекамі збожжа.

Сымон ціха прыхіліўся да ложка і выраўняў сваю згорбленую постаць на цьвёрдай, саламянай падсьцілцы.

Думкі злучаліся ў працяжны бесканечны адналькові ланцуг.

— На што патрэбна гэта арцель? Меў аднаго каня і таго прададуць. Трактар купляць... А на што гэты трактар? Выдумляюць, халеры! Людзей гэтаю арцеляю толькі збунтавалі. Галота! Арцель, абагуленьне!—скажэце, якія разумныя... а ўвосень увесь запас збожжа прадалі каапэратыву. Я-б прадаў! Убачаць! А як-жа!

Сымон перавярнуўся на другі бок.

— Я іх цяпер навучу як жыць,—думаў далей,—яшчэ пачуюць, хто такі Сымон Бжухальскі. Няхай толькі падымецца цана—прадам некалькі пудоў жыта. Куплю новы плуг і сукенку Уршулі, а рэшта збожжа можа найспакайней чакаць вясны.

Сымон уяўляў сабе ўжо ў думках як гэта Уршуля будзе выглядаць у новай сукенцы на кірмашы.

— Навару самагонкі, таксама трохі грошай прыпадзе. Ідыёты! Арцель, арцель ім патрэбна. Пакажу ім, пакажу...

Пазьней ўсё расплылося ў шэрай імгле і Сымон заснуў.

II.

— Ну, дык ужо бывай здароў таварыш!

— Бывай!

— Едзь ужо. Толькі бязь гэтага каня не вяртайся.

— Еду, еду!

Стась тузануў лейцы і калёсы павольна пакаціліся ўздоўж вуліцы.

— Слухай, Стась!—Стары Мацей, трасучы сваёй сівою барадой, пабег усьлед за возам і пачаў гаварыць у самае вуха.

— Вяртайцеся лепш уночы, каб вас ніхто ня бачыў.

— На што гэта?—папытаўся Стась.

— Гэта так, зробім неспадзянку. Заўтра зраньня людзі будуць разяваць вусны. Вось будуць дзівіцца, як мы гэтым жалезным канём будзем араць папар пад лесам!

Мацей думна паказаў рукой у бок лесу.

— Ну, добра, бывай!

Мацей вяртаўся, узьнімаючы нагамі слупы пылу.

— Глядзеце на яго,—хтосьці крыкнуў,— як трактар зямлю арэць, маем дармовую машыну.

Вясёлы выгук сьмеху вырваўся з некалькіх грудэяў.

— Чым яны плаціць будуць?—крыкнуў высокі і тонкі Войцех, паглядаючы на прысутных,—трактар-жа бяруць у крэдыт.

— Пачакай за год, два, будзем мець поўныя засекі, лёгка крэдыт выплацім.

III.

Позна ўночы абудзіўся Сымон. Хацеў падняць галаву, паварушыўся і зноў бясьсільна зваліўся на цьвёрдую зьбітую салому. Чуў, што яму не хапае паветра ў грудзёх, што нехта касьцісты і дужы трымае яго за глотку і так моцна сьціскае, што ў вачох зьмяняюцца разнакаляровыя колы, а другой ружой б'е па галаве.

Адчыніў вочы і на хвіліну ўбачыў праз густую хмару дыму чырвоныя іскужкі, якія жывымі языкамі гінулі дзесьці ў гары.

Сымон ссунуўся з саломы і на чацьвяронках выпаўз.

У гары над стоўпцю ўзьвіўся чорны слуп дыму. Як жывая страшная ведзьма агонь клубіўся тысячамі дзіўных фігур, дрыжэў крывавым бляскам агністых праменьняў.

Сымон з цяжкасьцю прыпомніў, што быў пры апараце, гнаў самагонку.

Хістаючыся на п'яных нагах, павалокся да вакна, дзе спалі жонка і дачка.

IV.

Крыва ўсьміхалася блядое раньняе сонца, кідаючы ўкосна прамені на шэрае попелішча. Сымон сядзеў на апаленай бэльцы і як зьбянтэжаны паўтараў:

— Дзьвесьці пудоў збожжа...

У гэты час у другім канцы вёскі пачуўся глухі гул. На яго адгукнуліся аглушаючы трэск матору, поўныя захапленьня і зьдзіўленьня людзкія галасы.

Сымон уздрыгнуў і падняў галаву. Перад ім стаяла Уршуля, а недалёка ціха плакала жонка.

Кулак устаў, але ня рушыўся з месца

— На наша няшчасьце гэта арцель,—рашыў,—а самае галоўнае гэта машына. Падлюга Стась!

Трактар затрымаўся, Стась зышоў з сядзэньня і з няўтоенаю радасьцю песьціў бліскучае жалеза.

Пасьля гэтага ўзяўся за тронак рэгулятара і трактар, радасна туркочучы, пасунуўся на працу, застаўляючы пасьля сябе дзьве роўныя глыбокія баразны ў пяску на дарозе.

Сотні вачэй зайздросна сачылі за кожным яго ўздрыгам.

В. Гароўскі, член польскай сэкцыі БелАППУ.

Магутная хваля пралетарскага гневу і абурэньня

супроць нячуванага разгулу фашыцкага тэрору ў Польшчы, супроць крывавых катаваньняў і забойстваў палітзьняволеных-- РАСЬЦЕ З КОЖНЫМ ДНЁМ

Працоўныя БССР працягваюць брацкую руку дапамогі рэвалюцыйным вязьням фашысцкай дыктатуры ў Польшчы

Магутная хваля пратэстаў супроць фашыцкага тэрору ў Польшчы ахапляе ўсё шырэйшыя і шырэйшыя колы працоўных мас Савецкай Беларусі. Кожны дзень у рэдакцыю паступаюць з усіх куткоў нашай краіны пратэсты. Працоўныя БССР на заклік брацкай кампартыі, на заклік 10 тысяч рэвалюцыйных вязьняў польскага фашызму, якім пагражае сьмерць ад фашыцкіх катаў, на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах, арганізуюць мітынгі пратэсту, зьбіраюць грошы ў фонд дапамогі палітзьняволеным.

— Агульны сход курсантаў 6-цімесячных банкаўскіх курсаў у сваёй рэзалюцыі пратэсту канстатуе, што польскі фашызм шляхам фізычнага зьнішчэньня сваіх палонынікаў рэвалюцыйнага руху, імкнецца задушыць рэвалюцыйны рух і гэтым самым расчысьціць сабе спакойны тыл для ўзброенага нападу на Савецкі Саюз. Агульны сход з абурэньнем пратэстуе супроць зьверскіх катаваньняў, супроць крывавых зьдзекаў над палітзьняволенымі ў фашыцкай Польшчы.

Сход пастанаўляе адлічыць 1 проц. месячнага заробку на дапамогу вязьням у фашыцкай Польшчы.

— Калгасьнікі калгасу імя X зьезду Саветаў БССР, Скарадзенскага сельсавету далучаюць свой голас пратэсту да мільёнаў працоўных Савецкай Беларусі супроць фашысцкіх катаў-забойцаў. Калгасьнікі ўносяць 71 руб. на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў».

— Рабочыя фабрыкі «Кастрычнік» на мітынгу пратэсту пастанавілі яшчэ больш разгарнуць работу МОПР'у, а таксама ўзмацніць збор сродкаў у фонд дапамогі палітзьняволеным польскіх турмаў.

— Рабочыя і служачыя заводу «Ударнік» у адказ на крывавыя дзеяньні польскага фашызму абавязваюцца яшчэ мацней змагацца за выкананьне прамфінпляну і лепшую рэалізацыю пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі. Рабочыя заводу «Ударнік» рашылі ўсе як адзін уступіць у рады МОПР'у, каб матар'яльна дапамагаць сваім братом—рэвалюцыйным рабочым і сялянам Польшчы, якія пакутуюць у фашыцкіх засьценках. Рабочыя на мітынгу аднагалосна рашылі адлічыць 1 проц. месячнага заработку на дапамогу палітзьняволеным.

— Дзевяць хворых у 1-й савецкай больніцы, прачытаўшы адозву ЦК МОПР'у Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі сабралі 17 руб. на карысьць палітзьняволеных фашысцкай Польшчы.

Такія-ж рэзалюцыі пратэсту выносяцца па ўсіх заводах, фабрыках, калгасах Савецкай Беларусі.

Прэч фашысцкую дыктатуру!

Прэч фашысцкіх катаў-забойцаў!

Няхай жыве рэвалюцыйны фронт рабочых і сялян Польшчы і яго кіраўнік—камуністычная партыя!

З Пінскай катоўні

У астрогах фашысцкай Польшчы кожны дзень сыстэматычна зьбіваюць, катуюць палітвязьняў. Новы турэмны рэгламант касуе заваяваныя ў бязьлітаснай барацьбе палітвязьняў з адміністрацыяй нязначныя правы палітзьняволеных прыраўнівае да крымінальнікаў, нават больш таго, ставіць палітзьняволеных у больш цяжкія, больш жорскія ўмовы.

Вось што пішуць палітзьняволеныя з Пінскай катоўні: «яшчэ ў 1930 годзе турэмная адміністрацыя распачала сыстэматычны паступ і паступова адбірала права на шпацар, права карыстацца кніжкамі, газэтамі, права дзяліць паміж палітзьняволенымі харч, забараніла пісаць лісты і г. д. Мала таго, калі заходзіць у камеру на чальнік вастрогу Колец вядомы садыст кат, былы інспэктар «сьвентакрыжскага» вастрогу і калі яму не спадабаецца палітзьняволены, або ня так стане як бы ён гэтага хацеў зараз-жа распачынаецца біцьцё і зьверскае катаваньне, пасьля чаго вязьня адпраўляюць на два тыдні ў карцар. І на працягу ўсяго часу колькі сядзіць у карцары палітвязень, закаваны на руках і нагах атрымлівае толькі васьмушку хлеба і конаўку вады. У дадатак кожны дзень у часе праверкі старшы дазорца штурхае нагамі, б'е на твары.

Адміністрацыя Пінскага вастрогу, правакуе на абвяшчэньне галадоўкі. У лістападзе 1930 году ўсіх палітзьняволеных выводзілі па адным з камеры на дварэ стаяў цэбар з халоднай вадой і тут-жа насільна распраналі, саджалі ў цэбар, пасьля чаго скоўвалі рукі і голага абстрыгалі і брылі, апраналі ў арыштанскую вопратку. Ітак усіх палітзьняволеных на чарзе перацягнулі ў камеры да крымінальнікаў.

Усе палітзьняволеныя абвясьцілі га ладоўку ў знак пратэсту. Галадалі 10 дзён. На працягу гэтых 10 дзён кожны дзень турэмная адміністрацыя і паліцэйскія атрады зьбівалі да страты прытомнасьці імкнуліся зламаць, пры душыць галадоўку. Аднак, ім гэта не ўдалося. Усе палітзьняволеныя сталі дружна і непахісна.

Але тое, што было летась у параўнаньні з сёлетнім зусім бляднее. Сёлета турэмная адміністрацыя яшчэ больш люта распраўляецца з палітзьняволенымі і фактычна ўчыняе масавыя забойствы, масавае зьнішчэньне палітвязьняў».

Польскі фашызм з надзвычайнай жорсткасьцю распраўляецца над сваімі палонынікамі. Вытрымка з гэтага ліста, які вырваўся з Пінскага засьценку, вядома не адбівае поўнасьцю ўсіх жахаў, якія адбываюцца ў вастрогах фашысцкай Польшчы. Польскі фашызм рыхтуе тыл для нападу на СССР, ён імкнецца зьнішчыць авангард пралетарыяту. Але гэта ня ўдасца польскаму фашызму. Грозная сіла працоўных мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі зьмяце фашысцкую дыктатуру.

Г.

Барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць

ВЫТРЫМКА З ЛІСТУ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНАГА АБ ГАЛАДОЎЦЫ Ў СТЭФАНСКАЙ ТУРМЕ

Дарагі т. В . . . . .

Учора толькі скончылася наша барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць з фашысцкай турэмнай адміністрацыяй,—скончылася сямідзённая галадоўка. Яшчэ сілы слабыя, але пішу і паведамляю цябе аб нашым жудасным цяперашнім становішчы.

Што-ж у нас чутно? Вельмі шмат. І на валовай скуры ўсяго не апішаш. У апошні час фашысцкая турэмная адміністрацыя пачала на нас шалёную атаку, хочучы ўвесьці фашысцкі турэмны рэглямант. Забараніла нам перадаваць з камеры ў камеру харчы, кнігі, газэты, ня прызнала нашага прадстаўніка, павесіла на вокны бляшаныя кошы, такім чынам у камеры цэлы дзень панае змрок. Адабрала вольную прагулку, ганяючы на прагулцы парамі на тры крокі адна ад другой. Калі мы супраціўляліся гэтаму, на нас накінулася цэлая зграя турэмных наглядальнікаў—каля 30 чалавек, з начальнікам турмы на чале. б'ючы нас ключамі, прыкладамі, нагамі і кулакамі, а за наш пратэст супроць тэрору пакаралі яшчэ на месяц, пазбавіўшы нас харчовых пасылак з волі, кніг, газэт, прагулак і г. д. ды яшчэ паабяцалі зрабіць справу за гэтак званыя «супраціўленьні ўладзе». Кожны амаль ліст, які высылаецца намі на волю, канфіскуецца. Немагчыма пералічыць ўсіх зьдзекаў, якія ўжываюцца фашысцкай турэмнай адміністрацыяй, каб задушыць нас, як фізычна, так і маральна.

... Наша становішча было даведзена да крайнасьці. І мы палітзьняволеныя Стэфанскай турмы разам з лукішкамі ўзяліся за нашу апошнюю зброю—галадоўку. Прыступілі да яе 12 лістапада 1930 г. у сераду. Няма нажаль месца, часу і магчымасьці апісаць усе тыя зьдзекі і катаваньні, якія мы перажылі за час 7-мідзённай галадоўкі. Скажу толькі аб некалькіх фактах. На 3-ці дзень галадоўкі, калі мы былі моцна аслабленыя, нас пачалі штучна карміць. У горла кожнаму запускалі гумовую кішку і налівалі звычайную турэмную зупу. Дыхаць было немагчыма. На кожнага навальваліся некалькі турэмных наглядальнікаў і выкручвалі рукі і ногі. Пасьля такога «кармленьня» валаклі ў карцар і па дарозе турэмныя наглядальнікі ў цёмных калідорах накідваліся, як зьверы і зьбівалі кожнага да страты прытомнасьці. Цягнучы назад у камеру—рабілі тое самае. Пракурор, бачучы ўсё гэта—толькі усьмехаўся. Нажаль няма магчымасьці напісаць больш. Калі будзе адпаведны час напішу больш і падрабязьней.

З ком. прывітаньнем: М. Т. (палітзьняволены Стафанаўскай гурмы).

Гомсельмаш

УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ

Гомель. 15. 13 жніўня выкацана поўнасьцю праграма па сіласарэзках—30 штук, па саломарэзках—8, бульбамойках — 3 і па сартыроўках—0.

У выкананьні заданьня па сіласарэзках мелася шмат тормазаў: першы, трэці і чацьверты працэсы ня выконвалі сваіх абавязацельстваў па дастаўцы дэталяў. Валы, пададзеныя мэханічным цэхам, былі прасьверляны няправільна, з-за чаго замест 34 дыскаў, выпушчана 30.

Нявыкананьне заданьня па саломарэзках тлумачыцца тым, што мэханічны цэх не забясьпечыў саломарэзачнымі дэталямі. Па бульбамойках заданьне ня выканана з-за адсутнасьці жалеза ¾ дзюйма для сыпіц да барабанаў. Іх можна было замяніць квадратным жалезам, але майстар лёгкакацельнага цэху Фінаў супярэчыў і не жадаў гэтага зрабіць.

Па бульбасартыроўках заданьне нявыканана галоўным чынам, патаму, што дрэваапрацоўчы цэх не забясьпечыў рамамі.

Яў. Р.

Штурмаваць прарывы ў стварэньні кармавой базы

З 20-га па 30-га жніўня—ударны дэкаднік ліквідацыі прарываў у сіласаваньні

Зламаць апартуністычныя рагаткі сіласаваньню. Стварэньне кармавой базы паставіць цэнтральнай задачай усіх партыйных і савецкіх арганізацый

Усім райкомам, гаркомам, КП(б)Б, РВК і гарсаветам

Мерапрыемствы па сіласаваньні ў справе стварэньня моцнай кармовай базы для разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі ва ўмовах БССР маюць вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне.

Аднак, у выніку недаацэнкі гэтага мерапрыемства, вызначаныя ЦК КП(б)Б і СНК БССР пляны сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў знаходзяцца пад пагрозай зрыву.

Плян сіласнага будаўніцтва (вежы, ямы і траншэі) у разьмеры 2.000.000 куб. мэтраў на 10 жніўня выкананы толькі на 12,1 проц., сіласаваньне кармоў амаль не распачата,—плян выкананы на 2,7 проц.

Асноўнымі прычынамі недапушчальна нізкага выкананьня пляну сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня ЦК КП(б)Б і СНК лічаць:

а) зусім недастатковую мабілізацыю партыйна-камсамольскіх арганізацый, шырокіх мас рабочых саўгасаў, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на выкананьне пляну сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў.

б) Праваапартуністычную недаацэнку вялізарнага гаспадарча-палітычнага значэньня сіласаваньня кармоў і злачынную бяздзейнасьць з боку большасьці дырэктароў саўгасаў, старшынь калгасаў, райкалгассаюзаў і раённых зямельных органаў.

в) Адсутнічаньне апэрацыйнага кіраўніцтва і кантролю з боку райкомаў, гаркомаў, райвыканкомаў і гарсаветаў.

Улічваючы неабходнасьць стварэньня моцнай і сталай кармовай базы для пашыраючайся сацыялістычнай жывёлагадоўлі БССР і выходзячы з задач, пастаўленых ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу аб разьвіцьці жывёлагадоўлі, ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць:

1. Райкомам і гаркомам КП(б)Б, райвыканкомам і гарсаветам неадкладна мабілізаваць партыйна-камсамольскія арганізацыі, шырокія рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы сялянства на выкананьне пляну сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў, павёўшы рашучую барацьбу в апартуністычнай недаацэнкай гэтага важнейшага мерапрыемства і забясьпечыў штодзённае кіраўніцтва і кантроль за ходам выкананьня пляну сіласаваньня па асобных саўгасах, калгасах і сельсаветах.

2. У мэтах ліквідацыі прарываў па сіласным будаўніцтве і сіласаваньні кармоў, ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць: з 20 па 30 жніўня правесьці ва ўсіх раёнах ударны дэкаднік, разгарнуўшы сапраўдна бальшавіцкія тэмпы ў справе сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў.

Для кіраўніцтва дэкадніка стварыць раённыя штабы пад старшынствам сакратароў райкомаў і гаркомаў КПБ.

3. Пацьвярджаючы раней устаноўленыя тэрміны па выкананьні пляну сіласаваньня 65 проц. да 1 верасьня і 100 проц. да 1 кастрычніка, ЦК і СНК абавязваюць партыйныя, камсамольскія, савецкія і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі безадкладна разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж асобнымі саўгасамі і калгасамі за поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну сіласаваньня кармоў пад лёзугам абавязковага стварэньня згодна пляну мільёну тон сілосу.

4. ЦК і СНК зварочае ўвагу райкомаў і гаркомаў, РВК і гарсаветаў на ўзмацненьне будаўніцтва сіласных ям і траншэй, не чакаючы завозу вежаў і дэфіцытных матар'ялаў для іх будаўніцтва, скарыстоўваючы мясцовы будаўнічы матар'ял.

5. ЦК і СНК прапануюць райкомам і гаркомам КП(б)Б, райвыканкомам і гарсаветам сыстэматычна, ня менш аднаго разу ў дэкаду, заслухоўваць на паседжаньнях РК, ГК, РВК і прэзыдыумаў гарсаветаў даклады аб ходзе сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня. На агульных партыйна-камсамольскіх сходах саўгасных і калгасных ячэек прапрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць выкананьне пляну сіласаваньня.

Раённым і насьценным газэтам шырока асьвятляць ход сіласаваньня па асобных саўгасах і калгасах.

ЦК КП(б)Б і СНК папярэджваюць усе партыйныя, савецкія і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі, што невыкананьне пляну па сіласаваньні кармоў будзе разглядацца, як апартуністычная недаацэнка пастаўленай партыяй задачы па стварэньні моцнай кармовай базы і па разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі і прапануюць паставіць задачу стапроцантнага выкананьня пляну сіласаваньня, як адну з цэнтральных баявых задач партыі і ўраду.

За Сакратара ЦК КП(б)Б
ГАНТМАН.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЭК.

Пакласьці канец апартуністычным адносінам да сіласаваньня

Адно з важных месц у вырашэньні праблемы жывёлагадоўлі займае сілос. Гэтага не разумелі кіраўнікі Зар—Шклоўскага сельсавету, Шклоўскага раёну, якія ніякай работы ў гэтым напрамку не вядуць. Да гэтага часу бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў нічога аб сілоснай кампаніі і значэньні яе ня ведаюць. У выніку гэтага важная кампанія правалена, бо прапала шмат расьлін, якія павінны быць ужо засіласаваны.

У калгасным сэктары тое-ж самае, ні слова нідзе не пачуеш пра сілос. Калгас «Пражэктар» засеяў крыху сланечніку і кукурузы, але засеў гэты загінуў, бо пазарастаў пустазельлем. Засевы ня былі своячасова прапалаты. Да будаўніцтва ям і траншэй ніхто ня прыступіў.

Неабходна пакласьці канец нядбайным адносінам да сілосу.

Я. Канькоў.

Толькі 6,5 проц. пляну

Па Чачэрскім раёне павінна быць за сіласавана 2129 тон зялёнай масы, але гэты плян ня выконваецца. На сёньняшні дзень раён мае толькі 12 леташніх сілосных ям, пабудова-ж новых ям выканана толькі на 5 проц. (замест 39 ям выкапана 2). Засіласавана толькі 4 старых ямы на 140 тон, што складае 6,5 проц. пляну.

Старасельскі сельсавет, Талочынскага раёну, зусім ня дбае пра сіласаваньне кармоў. Сіласаваньне па сельсавеце амаль сарвана. З 20 калгасаў 18 яшчэ ня выкапалі ям і зусім не падрыхтаваліся да сіласаваньня.

Сельсавет праявіў поўную бязьдзейнасьць у справе сіласаваньня. Парт'ячэйкі па мясцох таксама нічога ня робяць у гэтай справе.

П. Л. і К. К.

Арэшкаў, Зэйгер, Цукерман.

Сіласаваньне пад пагрозай зрыву

Абвешчаны дэкаднік штурму ня даў ніякага зруху

Вурокі мінулага году не навучылі Макіраўскі сельсавет, Полацкага раёну, своячасова ўзяцца за сіласаваньне кармоў. Ні ў калгасах, ні ў паасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках сіласаваньне не пачата. Сельсавет лічыць сіласаваньне справай не такой важнай, каб ёй варта было займацца.

Райкалгассаюз таксама ня бачыць зрыву сіласаваньня ў гэтым сельсавеце. Па сельсавеце трэба засіласаваць 929 тон зялёнага корму. Але плян гэты застаўся на паперы. З 10 калгасаў толькі адзін калгас «Савецкая Беларусь» пачаў падрыхтоўку сілосных ям, а пра аднаасобны сэктар і гаварыць ня прыходзіцца.

Трэба адзначыць, што пры раёне створаны штаб і абвешчаны дэкаднік штурму сілоснага прарыву. Аднак дэкаднік ня даў ніякага зруху.

Партыйна-камсамольскія арганізацыі нічога ня робяць па ліквідацыі прарыву ў сілосным будаўніцтве.

Трэба, нарэшце, сапраўды па-бальшавіцку ўзяцца за сіласаваньне, каб на вярстаць упушчанае.

Мікола Яроменка.

Сіласуйце віка-аўсяную мяшанку

Спэцыяльна сілосныя культуры, засеяныя ў БССР—сланечнік і кукуруза, даючыя вялікі ўраджай зялёнай масы, яшчэ ня могуць поўнасьцю задаволіць тэй патрэбы, якая-б забясьпечыла сакавітым кармом малочную жывёлу.

Мы павінны сіласаваць ня толькі спэцыяльна сілосныя культуры—сланечнік і кукурузу, але і ўсё, што магчыма скарыстаць на сілос: розныя атавы, асокі, націньне, пустазельле, бульбянік і інш.

Вялікую ролю ў гэтай справе павінна адыграць віка-аўсяная мяшанка, якая дае досыць каштоўны сілас. Віка-аўсяная мяшанка ў Савецкай Беларусі зьяўляецца вельмі распаўсюджанай культурай, якая ідзе на зялёны корм, сена і сілас. Значная колькасьць пасеваў вікі-аўса можа быць выкарыстана на сілас, тым больш, што пад восень сушка яе на сена ідзе надта марудна з-за дажджлівай пагоды.

Сіласаваць віку-авёс трэба пачынаць з часу поўнага цьвяценьня і канчаючы момантам стварэньня стручкоў на вяршынках вікі. У гэты час яна мае—70—75 проц. вільготнасьці, частка якой (каля 5 проц.) траціцца пры кашэньні і перавозцы і застаецца як раз столькі вільгаці, колькі яе патрэбна мець пры сіласаваньні. Пазьнейшая ўборка хоць і дае прыбаўку пажыўнай матэрыі, але маса робіцца больш грубай і менш каштоўнай.

Сіласаваць лепш, як і іншыя расьліны, у рэзаным выглядзе, чым дасягаецца больш шчыльная ўтрамбоўка і выдзяленьне соку з каморак расьлін.

Пры адсутнасьці сіласарэзак, можна сіласаваць і ў нарэзаным выглядзе, але трэба вельмі моцна трамбаваць яе.

Віка-аўсяны сілас замяняе моцны корм

Віка-аўсяны сілас мае значэньне ня толькі як матар'ял для сіласаваньня наогул, але дзякуючы таму, што мае вялікую колькасьць бялка і дае магчымасьць замяніць значную частку моцных кармоў у рацыёне малочных кароў, у значнай меры ён можа папоўніць недахват бялковых кармоў непасрэдна ў сваёй гаспадарцы.

Пытаньне кармовай вартасьці гэтага сілосу вывучаў сэктар «Карма і кармленьня» Горацкай Занальнай Станцыі Малочнай Г-кі, ўзімку 1931 г. Пажыўная каштоўнасьць віка-аўсянага сілосу параўналася з моцнымі кармамі—ячнымі вотрубямі. У кармовым рацыёне кароў 10 кілё сілосу замянялася 1,2 кілё вотрубяў.

Гэта замена пры кармленьні ня зьніжала ўдояў і пры пераходзе ад вотрубяў да сілосу, каровы вельмі ахвотна яго зьядалі, не пакідаючы аб'едкаў.

Норма дачы віка-аўсянага сілосу карове ў суткі можа быць даведзена да 25 кілёграм бяз усякага ўплыву на здароўе жывёлы.

Віка-аўсяны сілас, як падкормка ў летні пэрыяд

Карміць кароў сіласам можна ня толькі ў зімовы час, але можна загатаўляць яго столькі, каб хапіла і на веснавы і нават летні час. Гэта мае вялікае значэньне ў тым выпадку, калі гаспадаркі не забясьпечаны добрымі пашамі і пры адсутнасьці ў гэты час яшчэ зялёнай масы, віка-аўсяны сілас адыграе значную ролю, папоўніўшы недахват у кармох.

У гаспадарцы станцыі віка-аўсяны сілас засіласаваны ў цэмантавай яме добра захоўваецца да лета наступнага году. Падкормка кароў у пашы малага веснавога травастою на пашы ў гаспадарчых умовах далі добры вынік, бо прышоўшыя з пашы каровы прагна зьядалі сілас.

Пры правядзеньні досьледу, калі аднэй групе кароў давалася ў якасьці падкормкі 12 кілё віка-аўсянага сілосу, а другой аналёгічнай групе—12 кілё сьвежа-скошанай зялёнай мяшанкі, удої сіласнай групы ня толькі ня зьнізіліся, а нават далі яшчэ невялікую прыбаўку.

Не паслабляючы вялікага значэньня пасеваў спэцыяльна сіласных расьлін, віка-аўсяная мяшанка ў бліжэйшы час павінна зьявіцца моцнай базай для сіласаваньня, як культура вельмі распаўсюджаная і пры спрыяючых глебавых умовах дае досыць многазялёнай масы са значным утрыманьнем бялка.

А. Капусьціна.

На сацыялістычныя палі

машыны, угнаеньні са складаў

Максымальна скарачаючы тэрміны ўборкі ўраджаю, пераключыцца на ўзьняцьце зяблева і разгортваньне асеньняй сяўбы

Трактары і прыцэпныя машыны—у баявую гатоўнасьць

Забясьпечыць завоз і скарыстаньне мінэральнага ўгнаеньня

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра завоз і рэалізацыю мінэральнага ўгнаеньня да асеньняй пасеўнай кампаніі 1931 г.

Выслухаўшы даклад час. вык. аб. загадчыка беларускага аддзяленьня Усесаюзнага аб'яднаньня «Мінугнаеньне» т. МІСЬНІКОВА і садаклад прадстаўніка НК РСІ т. ВАРОНІНА аб выкананьні пляну завозу і рэалізацыі мінэральнага ўгнаеньня ў саўгасах і калгасах БССР, Камісія Выкананьня пры СНК БССР ўстанаўляе, што:

а) плян завозу мінэральнага ўгнаеньня, асабліва саўгасам, выконваецца марудныя тэмпамі (завезена да 1 жніўня—30 проц. у параўнаньні з плянам), якія не забясьпечваюць поўнага завозу мінэральнага ўгнаеньня да асеньняй пасеўнай кампаніі;

б) галоўнаю прычынаю нездавальняючага завозу мінэральнага ўгнаеньня зьяўляецца недаацэнка сельскагаспадарчымі трэстамі, асабліва Белсельтрэстам і Насентрэстам, цэнтрамі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы і раённымі каапсаюзамі значэньня мінэральнага ўгнаеньня ў справе падвышэньня ўраджайнасьці (несваячасова даюцца, зьмяншаюцца і нават зусім не даюцца заяўкі і разнарадкі на мінэральнае ўгнаеньне, а некаторыя ня хочуць выкупляць угнаеньне), а таксама няўменьне Народнага Камісарыяту Земляробства, Белкалгасцэнтру і іншых снабжаючых арганізацый праводзіць укараненьне мінэральнага ўгнаеньня ў сельскую гаспадарку.

Выходзячы з паказанага, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць кіраўнікоў: Бел. к-ры трэсту «Сьвінавод» т. АЎЧЫНІКАВА, Насентрэсту—т. МАРТЭНСОНА, Беллёканапляводсаюзу—т. ЛАЦІСА, Бел садгародсаюзу т. ПАНАМАРОВА, Бел хлебжывёлсаюзу—т. ЖУРОМСКАГА не пазьней як праз два дні даць Беларускаму аддзяленьню аб'яднаньня «Мінугнаеньне» заяўкі і разнарадкі на поўную колькасьць мінэральнага ўгнаеньня, прадугледжанага плянам, а таксама забясьпечыць своячасовы выкуп мінэральнага ўгнаеньня, якое паступае з заводаў, саўгасамі і раённымі каапсаюзамі.

2. Ускласьці на старшынь раённых выканаўчых камітэтаў адказнасьць за своячасовую рэалізацыю мінэральнага ўгнаеньня, папярэдзіўшы іх, што ў выпадку несваячасовай рэалізацыі ўгнаеньня, яно будзе накіроўвацца ў іншыя раёны.

3. Абавязаць Наркомы Камісарыят Земляробства і Бел. аддз. аб'яднаньня «Мінугнаеньне», пад адказнасьць т. т. ПАНІМАТКІ і МІСЬНІКОВА, ужыць захады да своячасовага завозу мінэральнага ўгнаеньня з тым, каб скончыць завоз мінэральнага ўгнаеньня ў БССР да наступных тэрмінаў:

у паўночную зону да 25 жніўня,
у сярэдную зону да 1 верасьня,
у паўднёвую зону да 5 верасьня

забясьпечваючы своячасовае скарыстаньне ўгнаеньня пад пасевы.

Даручыць т. МІСЬНІКОВУ рашуча палепшыць апэрацыйны падлік завозу ўгнаеньня, устанавіць кантроль за своячасовым выкупам і рэалізацыяй угнаеньня і аб усіх выпадках парушэньня гэтага паведамляць Упаўнаважанага СНК па пасеўнай кампаніі.

Даручыць Белкалгасцэнтру (пад адказнасьць т. Стрэле), сельскагаспадарчым трэстам (пад адказнасьць кіраўнікоў апошніх) Белкаапсельгасаб'яднаньню (пад адказнасьць т. Вайцахсвіча) забясьпечыць своячасовы выкуп і рэалізацыю ўгнаеньня, якое прыбывае з заводаў для асеньняй пасеўнай кампаніі.

Даручыць пракурору рэспублікі прыцягнуць да суровай адказнасьці т.т. Турцэвіча (Бел. К-ра трэсту «Сьвінавод»), Вайцахоўскага, (Бел. К-ра Саюзпрамкорму), Іванова і Штэйнберга (с.-г. каапэрацыя) за невыкананьне імі пастановы НК РСІ за 27 чэрвеня г. г., якой на іх была ўскладзена адказнасьць за дачу заявак і разнарадак на штучнае ўгнаеньне.

5. Прапанаваць Кіраўніку Хімаб'яднаньня т. Ківелю і дырэктару Крычаўскага заводу т. Даніловічу цалкам выканаць нарады бел. аддзял. аб'яднаньня «Мінугнаеньне» на завоз у саўгасы і калгасы БССР фасфарытнай мукі.

Даручыць НК РСІ не пазьней як праз 5 дзён праз раённыя КК РСІ праверыць ход завозу штучных угнаеньняў у раёны, а таксама прасачыць за выкананьнем паказанага даручэньня, прыцягваючы да суровай адказнасьці асоб, вінаватых у зрыве пляну завозу і ў прастоі вагонаў з прычыны нявыкупу.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР К. Бэнэк.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. Элькін.

10 жніўня 1931 г.
г. Менск.

Поўнасьцю і рацыянальна выкарыстаць с-г. машыны

Мэханізаваны спосаб пасеву, уборкі і апрацоўкі с.-г. культур адыгрывае вялікую ролю, даючы больш высокі агратэхнічны і эканамічны эфэкт. Эканамічны эфэкт машыны залежыць ад ступені яго поўнага і мэтазгоднага скарыстаньня.

Але абсьледваньні, якія рабіліся прадстаўнікамі Наркамзему, і матар'ялы, якія паступаюць з месц, з усёй яскравасьцю сьведчаць аб поўнай недаацэнцы гэтых мерапрыемстваў.

За 1930 і 31 г. у БССР завезена звыш 4.500 зернавых сеялак. Сяўба радавой сеялкай дае эканомію пасеўнага матар'ялу ня менш 30 кгр. на га, г. зн. што 6.000—7.000 зернавых сеялак пры іх скарыстаньні 30 дзён у год (20 увесну і 10 ўвосень) даюць эканомію ў 16—19 тысяч тон зярня, альбо 1.120 тыс. руб. (мінімальна).

Між тым выкарыстаньне сеялак у раёнах нікудышнае. 31 Райкаапсаюз на складах трымае 427 сеялак ў той час, калі партыя і ўрад ўпарта патрабуюць поўнага выкарыстаньня ўсіх сельскагаспадарчых машын. Лепельская і Сененская МТС ў часе веснавой сяўбы зусім не выкарыстоўвалі сеялак, а сеялі ўручную.

На Горацкай МТС фактычнае скарыстаньне сеялак складае 7,5 проц., а па Заслаўскай—5,4 проц.

Дрэнна выкарыстоўваюцца трактары, ня гледзячы на дырэктывы аб поўнай нагрузцы і скарыстаньні іх на больш цяжкіх работах. Дырэктары трэстаў ня прымаюць належных мер да наладжваньня працы трактараў у саўгасах. У ліпені г. г. ў саўгасе Вузьдзянка Белсаўгастрэсту, 2 фардзонпуцілаўцы займаліся возкай гною пры прыцэпцы толькі аднаго параконнага возу, патрачана 493 трактара-гадзіны, страчана 1752 кг. газы і г. д.

Такія адносіны да скарыстаньня трактараў і с.-г. машын паказваюць на ігнараваньне некаторымі работнікамі дырэктыў партыі і ўраду па барацьбе са стратамі і па поўным скарыстаньні с.-г. машын. Неабходна з корнем вырваць абязьлічку. 100 проц. скарыстаньне ўсіх машын і цягавай сілы павінна быць ажыцьцёўлена ў час ўборачнай і асеньняй пасеўкампаніі.

Агр. М—н.

Зяблівае ворыва на бальшавіцкія тэмпы

Па калгасным сэктары Віцебшчыны ўзьнята папару 58 проц. пляну, па адна асобным сэктары—70 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць, што гэтая работа не набыла яшчэ належных тэмпаў, асабліва па калгасах.

Н. Дварсон.

З фронту збожжазагатовак—трывожныя сыгналы

Ворша і Бабруйск зрываюць бесьперабойную работу хлебнага канвэеру

Рашуча ўдарыць па зрыўшчыках збожжазагатовак

Аршанскія загатоўцы зрываюць хлебны канвэер

ВОРША. (Наш кар.). Пятнаццацідзёньнік праверкі падрыхтаванасьці да збожжазагатовак на Аршаншчыне прайшоў зусім няпрыкметна. Арганізаваны раённы штаб праверкі ў гэтым напрамку зрабіў зусім мала.

Паседжаньні штабу ў большасьці выпадкаў зрываліся з прычыны няяўкі членаў штабу, а калі і праводзіліся, дык таксама праходзілі пры няпоўным складзе членаў.

Кампанію збожжазагатовак па Аршаншчыне сустракаюць непадрыхтавана. Галоўны загатоўца—райспажыўсаюз—яшчэ зусім не падрыхтаваны да збожжазагатовак.

Райкалгассаюз таксама яшчэ нічога не зрабіў у справе вылучэньня ў кожным калгасе аднаго члена праўленьня адказным за справу збожжазагатовак, калі ня лічыць данага ім указаньня калгасам аб падрыхтоўцы да бястарных перавозак збожжа. Райкалгассаюзам да гэтага часу яшчэ не праведзена перадача райспажыўсаюзу дагавароў аб кантрактацыі збожжавых культур. У райкаапсаюзе няма яшчэ тары на загатоўку гароднінны. Белсадсаюз абяцаў даць для гэтай мэты 1.500 бочак, а зараз, калі ўжо бочкі патрэбны да зарэзу, ён прыслаў паперку: «Забясьпечце сябе бочачнай тарай—праз Сампрамсаюз».

Такім чынам райкаапсаюз застаецца без галоўнага віду тары—бочак.

У практыцы работы аршанскіх загатоўцаў ужо зараз наглядаюцца такія зьявішчы, калі з прычыны непадрыхтаванасьці складаў Саюзхлеба і райспажыўсаюзу здаччыкі збожжа прымушаны везьці хлеб дамоў, назад. Так, напрыклад, калгас «Ленінскі Шлях», Бразьдзечынскага сельсавету, які прывёз чырвоны абоз збожжа на склад Саюзхлеба, з прычыны непадрыхтаванасьці апошняга прымушаны быў весьці збожжа назад.

Між тым, чырвоныя абозы са збожжам пачынаюць ужо паступаць амаль штодня. Збожжа здаюць ня толькі калгасы, але разам з імі і аднаасобнікі.

Пры такім становішчы, калі пачаліся ўжо фактычна збожжазагатоўкі, такія безадказныя адносіны з боку загатоўчых органаў да падрыхтаванасьці к збожжазагатоўкам зьяўляюцца ні ў якім разе недапушчальнымі.

Трэба рашуча ўзмацніць тэмпы падрыхтоўкі да прыёмкі збожжа, да збожжазагатовак.

А. Кудрын.

За 2-ую пяцідзёнку жніўня

4,4 проц. месячнага пляну

Апартуністычная бязьдзейнасьць і спадзяваньні на самацёк пануюць у Бабруйскім райспажыўсаюзе

Асноўны цяжар работы ў час хлебазагатоўчай кампаніі прыпадае на сыстэму спажывецкай каапэрацыі як на асноўнага загатоўцу. Аднак гэта, як відаць, мала турбуе бабруйскіх каапэратараў. Апарат спажыўсаюзу да гэтага часу зусім ня рыхтаваўся да загатовак, зрываючы сваёй злачынай бязьдзейнасьцю гэту падрыхтоўку і цалкам пакладаючыся на самацёк.

Да 1 жніўня райспажыўсаюзам павінна быць арганізавана загатоўчая кантора, аднак гэтай канторы і на сёньняшні дзень яшчэ не арганізавана. Пры райспажыўсаюзе ўжо да гэтага часу павінен быць арганізаваны спэцыяльны сэктар збожжазагатовак, які павінен кіраваць і арганізоўваць гэтую справу, але нічога гэтага няма. Нават ня прыступлена да ўкамплектаваньня гэтага сэктару працаўнікамі і ня вылучана адказнае асобы за правядзеньне загатовак. Да гэтага часу палова сельскіх саветаў не атрымала кніжак кантрактантаў.

На тэрыторыі раёну ў час збожжазагатоўчай кампаніі павінна працаваць два прыёмных пункты, але ўкамплектаваньне гэтых пунктаў работнікамі яшчэ не пачыналася. Райспажыўсаюз імкнецца тлумачыць сваю бязьдзейнасьць у гэтым пытаньні сугуба аб'ектыўнаю прычынаю—«няма работнікаў».

Пытаньне аб правядзеньні збожжазагатовак разглядалася на нарадзе старшынь спажывецкіх таварыстваў. На гэтай нарадзе вынесена шмат каштоўных пастаноў, але, на вялікі жаль, амаль што ніводная з гэтых пастаноў ня выканана.

У парадку самакрытыкі Райспажыўсаюз цалкам згаджаецца з тым, што яго нізавы апарат у значнай ступені не адпавядае пастаўленым перад ім задачам, што ён засьмечан клясававарожымі элемэнтамі, але да гэтага часу райспажыўсаюз ня ўжыў ніякіх захадаў да ачышчэньня яго ад гэтых клясава-варожых элемэнтаў.

Кіраўніцтва райспажыўсаюзу не справілася з ускладзенымі на яго задачамі і сваёй апартуністычнай бязьдзейнасьцю спрыяе павялічэньню прарыву ў гэтай адказнейшай рабоце.

Гэтае апартуністычнае кіраўніцтва Райспажыўсаюзу павінна быць зьнята і чым хутчэй гэта будзе зроблена, тым лепш.

Брыгада «Сав. Бел»:
Дамброўскі А., Падокшык С.

У бой за паперу

Аднаўленьне фабрыкі „Спартак" пад пагрозай зрыву

Ход будаўнічых работ выклікае трывогу. Матар'ялы ёсьць—няма толькі барацьбы з павольнымі тэмпамі і апартунізмам на практыцы

За 13-га жніўня фабрыка «Спартак» выпрацавана 17,4 тон паперы, што складае 47,62 проц. пляну. Дрэннае выкананьне праграмы тлумачыцца вялікім прастоем машын (41,9 проц. прастою). Машыны стаялі з-за недахвату энэргіі. Дызель № 2 стаяў цэлых 19 гадзін 30 хвілін.

Гэта ня першы факт прастою з-за недахвату энэргіі. З кожным днём фабрыка ўсё больш адчувае сваё вузкае месца энэргетыкі.

Трэба патрабаваць ад усіх рэспубліканскіх арганізацый Саюзпаперы (праўленьне ў Маскве і аддзяленьне групавога праўленьня ў Менску) энэргічнага націску на ГЭТ ў сэнсе выкананьня заказаў на маторы.

На будаўніцтве фабрыкі як і раней не разьвіты бальшавіцкія тэмпы. Зараз будаўнічымі матар'ялямі на работы першай чаргі, фабрыка забясьпечана. Атрымана партыя цэглы з Магілёва, атрымана цэмэнт, ёсьць вапна. Ёсьць нарады і адгружаюцца для фабрыкі партыі будаўнічых матар'ялаў. **Нарэшце ўжо прыбылі чарцяжы да будаўніцтва.**

Ня гледзячы на ўсе спрыяючыя ўмовы, будаўніцтва ледзь пасоўваецца наперад.

Саюз будаўнікоў і партарганізацыі павінны наладзіць асобы кантроль над будоўляй. Неабходна мабілізаваць рабочую грамадзкасьць вакол гэтага пытаньня.

Злачынна марудными тэмпамі ідзе вывазка торфа з балота на фабрыку «Спартак». Да сёньняшняга дню торф ня вывезен.

Брыгада «Сав. Бел.».
Гарын, Залманаў, Магілевіч.

Ліквідаваць тэхніка-эканамічныя хібы ў рабоце ф-кі „Спартак"

У трэцім квартале 1931 г. папяровая фабрыка «Спартак» працуе з асаблівым напружаньнем. Супала так, што **неабходна наладзіць вытворчы працэс з гэткімі важнымі работамі, як будаўніцтва і поўны пераход на ток БелДРЭС'у.** Калі да гэтага дадаць, што застаўся адзін квартал да пачатку буйных рэканструкцыйных работ, дык зробіцца ясным, што на адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал і на ўвесь калектыў фабрыкі выпадае вельмі адказная работа, вялікага гаспадарча-палітычнага значэньня.

Засталося вельмі мала часу да асеньня-зімняга сэзону і зусім зразумела таму імкненьне фабрычных арганізацый фарсіраваць ход будаўнічых работ па аднаўленьні некаторых цэхаў. Аднак, паранейшаму важнейшым пытаньнем застаецца пытаньне аб наладжваньні вытворчасьці, выкананьне прамфінпляну і рацыяналізацыя тэхнелёгічных працэсаў.

Прайшло досыць часу пасьля пастаноў камісій ЦК і шматлікіх абсьледваньняў з боку кіруючых арганізацый папяровай прамысловасьці, каб судзіць аб гнуткасьці і працаздольнасьці фабрычнага кіраўніцтва.

Пасьля пажару фабрыка была пушчана досыць хутка. **Гераічнымі намаганьнямі рабочага калектыву і інжынэраў вытворчасьць была наладжана звыш чаканьня ў найкарацейшы тэрмін.** Зьмена кіраўніцтва ў фабрычным трыкутніку плюс вопытнае тэхнічнае кіраўніцтва, далі штуршок да новага ўздыму ў рабоце.

Мы зьяўляемся сьведкамі энэргічнай работы ў сучасны момант, аднак ёсьць яшчэ цэлы рад хібаў у рабоце фабрыкі.

Вельмі марудными тэмпамі ідзе выкананьне тэхнічных указаньняў па лініі рацыяналізацыі вытворчасьці і ўдасканаленьня тэхнічнага працэсу.

Наступным важным мерапрыемствам, якое таксама не праведзена ў жыцьцё, зьяўляецца **утылізацыя зваротных вод 2 і 3 папяровых машын.** Цяпер крыху зьмяняецца схэма, з прычыны пераходу лавушак на 2 этап. Між тым у аддзелах заводакіраўніцтва яшчэ не распрацавана новая схэма утылізацыі зваротных вод, а аддзел забясьпечаньня не прыстасаваў сваёй работы па падшуканьні патрэбнай арматуры.

Ужо паўтара месяца назад устаноўлена **арматура для пятага таварнага рола** да першай папяровай машыны, але чамусьці да гэтага часу **затрымліваецца набудова бэтоннай ванны.** Гэ-

Характарна, што такое мерапрыемства, як **вэнтыляцыя 1-ай папяровай машыны затрымліваецца** з-за адсутнасьці каштарысу. Заводакіраўніцтва, якому Саюзпапера даручыла скласьці каштарыс, ня выканала даручэньня.

Праектуемая ўстаноўка вэнтыляцыі магла-б даць эфэкт у сэнсе павялічэньня зьёму паперы з 1 кв. мтр. паверхні сушыльных цылíндраў.

Да гэтага часу **ня пушчаны матор для каалінаваных чанаў,** што затрымлівае здачу напаўняючых матэрыі у паперу ў поўным аб'ёме і тым самым падаражае прадукцыю. Эканамайзэр для кацельнай да гэтага часу не заказаны і вадамеры не працуюць.

Да сучаснага моманту ня зусім здавальняюча выконваліся заказы па бягучым рамонце. Яўна нездавальняюча адрамантаваны перакатныя варштаты. Затрымаўся рамонт сухапарніка 1-й ніжняй групы сушыльных цылíндраў (у 1-й папяровай машыне) ад чаго псавалася хутчэй сушыльнае сукно. Заслугоўвае ўвагі прапанова інжынэра тав. **Млоціна** аб прымацаваньні сьлесароў рамонтна-мэханічнай майстэрні да пэўных машын і варштатаў для ліквідацыі абязьлічкі.

Аддзел рацыяналізацыі не ўкамплектаваны і працуе слаба. Як канстатавала тэхнічная нарада, гэты аддзел ня выканаў пляну рацыяналізацыі і нічога ня ўжыў у сэнсе пастаноўкі новых дасьледчых работ. Мы з свайго боку можам дадаць аб гэткай-жа рабоце фабрычнай лябараторыі. Другі раз на старонках нашай газэты мы ўзьнімаем пытаньне аб увядзеньні бракеражу.

Усе гэтыя тэхнічна-вытворчыя недахопы перапляцаюцца з эканамічнымі. Можна сьмела канстатаваць, што гасразьлік ня ўведзены як арганічная складаная частка гаспадарчага жыцьця фабрыкі, хоць сыстэма гасразьліку прапрацавана. У гэтым напрамку за-

Рабочая маса фабрыкі, у першую чаргу ўдарнікі, павінны ведаць усе таемнасьці калькуляцыі, якая зьяўляецца люстрай вытворчасьці. Вось чаму мы лічым зусім неабходным паставіць перад паасобнымі групамі рабочых цэлы рад эканамічных пытаньняў.

Да гэтага часу з паступаючых матар'ялаў ад рабкораў у насьценгазэту і заводзкую шматтыражку відаць, што работа па падрыхтоўцы кадраў (ФЗУ, практыканты, тэхнічная прапаганда) ня стала ў цэнтры ўвагі кіраўніцтва.

Цяпер, калі гэта пытаньне робіцца асноўным каменем нашай тэхнічнай рэканструкцыі, нашы прадпрыемствы павінны самым уважлівым чынам вывучыць пастановы ЦК па пытаньні аб тэхнічнай прапагандзе.

Гэтым пытаньнем павінна заняцца прэса і займецца рабкораўскі рух па нашай фабрыцы «Спартак».

Перад папяровай прамысловасьцю адкрываюцца ў наступным 4 годзе пяцігодкі вялізарныя пэрспэктывы. Яны могуць усякага натхніць і акрыліць. Але перш за ўсё фабрыцы «Спартак» ня трэба забываць, што ў першую чаргу неабходна нармалізаваць парушанае вытворчае жыцьцё аднэй з буйнейшых фабрык БССР.

З. Гарын.

1-га верасьня—у „Дзень вучобы“

усіх няпісьменных і малапісьменных—за вучобу, за кніжку.

Менск да 1 верасьня ў асноўным ужо ліквідуе няпісьменнасьць. Рабочыя і працоўныя Гомелю змагаюцца за ператварэньне да 1 кастрычніка гораду ў суцэльна-пісьменны

Чэрвеньскі раён змагаецца за атрыманьне ганаровага сьцягу ЦК КП(б)Б

Гарады і раёны БССР, уключайцеся ў барацьбу за атрыманьне ганаровага сьцягу ЦК КП(б)Б!

За суцэльную пісьменную БССР

«Ператварэньне БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці, зьліквідаваўшы рэшткі няпісьменнасьці сярод рабочых і дапрызыўнікаў да 1-га кастрычніку 1931 г.» (З пост. ЦК КП(б)Б),—адна з асноўных задач 1931—32 навучальнага году.

За вырашэньне гэтай адказнейшай задачы павінны па-бальшавіцку узяцца партыйныя, камсамольскія, савецкія, прафсаюзныя і іншыя грамадзкія арганізацыі. Гарады і раёны Савецкай Беларусі шляхам самага шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінны змагацца за датэрміновае выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б—за ператварэньне гарадоў і раёнаў у суцэльна пісьменныя.

Зьмешчаемыя сёньня ў нашай газэце матар'ялы сьведчаць аб тым, што рабочыя і працоўныя Менску і Гомелю па-баявому змагаюцца за датэрміновае выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б. Больш таго, ужо ёсьць усе падставы для таго, каб абвясьціць Менск 1 верасьня—у «Дзень вучобы»—горадам суцэльнай пісьменнасьці, бо ў асноўным да гэтага тэрміну няпісьменнасьць будзе зьліквідавана. Гомель змагаецца за тое, каб дабіцца суцэльнай пісьменнасьці да 1 кастрычніка.

Чэрвеньскі раён рапартуе аб гатоўнасьці да навучальнага году.

Усе гарады і раёны павінны па прыкладу Менску і Гомелю ўзьняць працоўныя масы на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць, на датэрміновае выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б.

Трэба рашуча і бязьлітасна біць па ўсіх тых, хто справу ліквідацыі няпісьменнасьці лічыць другараднай. Трэба ўзьняць працоўныя масы БССР на разгорнутую бальшавіцкую падрыхтоўку да навучальнага году з тым, каб 1-га верасьня ўсіх няпісьменных і малапісьменных пасадзіць за вучобу. Органы Наркамасьветы, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і іншыя грамадзкія і гаспадарчыя арганізацыі павінны забясьпечыць бесьперабойную работу ліквпунктаў і школ малапісьменных. Камсамол—павінен перавыканаць узятае на сябе абавязацельства ў сэнсе вылучэньня культармейцаў для ліквідацыі няпісьменнасьці.

Рабочая кляса і працоўныя БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б даб'юцца датэрміновага ператварэньня БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, што дасьць магчымасьць яшчэ больш шпаркімі тэмпамі рухацца наперад—да сацыялізму.

Менск на парозе суцэльнай пісьменнасьці

Заклік рабочых заводаў імя Варашылава аб ператварэньні Менску ў горад суцэльнай пісьменнасьці знайшоў шырокі водгук сярод рабочых Менскіх фабрык і заводаў. Вучастковыя штабы па ліквідацыі няпісьменнасьці паставілі перад сабой задачу да 11 ліпеня—дню гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў—усіх няпісьменных пасадзіць за вучобу. З удзелам культармейцаў-рабочых на ўсіх прадпрыемствах і на пабудовах быў ва ўдарным парадку праведзен дадатковы вучот неахопленых ліквпунктамі, была разгорнута растлумачальная работа па ўцягненьні ўсіх няпісьменных на ліквпункты.

У выніку на 11 ліпеня ўсе няпісьменныя рабочыя і члены прафсаюзаў былі пасаджаны за вучобу. Па горадзе працавала і працуе 245 ліквпунктаў, у якіх навучаецца 2932 няпісьменных і малапісьменных. Работа па ліквпунктах праходзіць пад лёзунгам—**да 1 верасьня ператварыць Менск у горад суцэльнай пісьменнасьці.**

Гаворачы аб дасягненьнях у галіне баёў за суцэльную пісьменнасьць у Менску, нельга абыйсьці моўчкі і тыя недахопы, якія ёсьць на гэтым адказным вучастку фронту культурнай рэвалюцыі. Менскі камсамол ня выконвае свайго абавязацельства,—замест 300 культармейцаў гарком ЛКСМБ даў сьпіс на 152 чал., а фактычна працуюць на ліквпунктах толькі... 15 камсамольцаў. Завод імя Варашылава абавязаўся даць 100 культармейцаў, а даў ня больш 10, завод «Камунар» вылучыў для работы на ліквпунктах і таго менш; такі малюнак і на некаторых іншых прадпрыемствах і прафсаюзах.

Ня ўсе партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі па бальшавіцку змагаюцца за суцэльную пісьменнасьць. Так, на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» з 67 няпісьменных і малапісьменных навучаецца толькі 31 чал. і заводзкія арганізацыі ня прымаюць мер да ліквідацыі гэтага прарыву. На Эльводзе з 44 чал. навучаецца 24; па шклозаводзе «Пралетары» справа яшчэ горш,—з 58 няпісьменных і малапісьменных вучобай ахоплена ўсяго 15 чалавек; у «Малым рамонце вагонаў» з 40—навучаецца 17; на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» з 61 чал. займаюцца на ліквпункце толькі 35.

Камсамол Менску павінен ліквідаваць свой прарыў і даць кадры культармейцаў для работы ў ліквпунктах. Тое-ж павінны зрабіць фабрыкі і заводы, якія ўзялі на сябе абавязак вылучыць культармейцаў. Прафсаюзы павінны неадкладна ліквідаваць сваю грашовую запазычанасьць па ліквідацыі няпісьменнасьці. Усіх няпісьменных і малапісьменных, неахопленых ліквпунктамі, трэба неадкладна пасадзіць за вучобу і сыстэматычна правяраць работу ліквпунктаў.

Брыгада «Сав. Бел.» і «ЗКП»
Лебедзяў, Руткоўскі.

Чэрвеншчына рапартуе аб падрыхтоўцы да навучальнага году

ЦК КП(б)Б, Наркамасьветы і рэдакцыям газэт „Савецкая Беларусь“ і „За коммунистическое просвещение“

Рапарт Чэрвеньскага раёну

Падрыхтоўка да 1931-32 навучальнага году па раёне распачата з красавіка 1931 году. У красавіку—маі інспэктарыятам народнай асьветы распрацаваны матар'ялы па забесьпячэньні школ і школьнікаў абуткам, вопраткай, навучальнымі прыладамі, падручнікамі, абсталяваньнем, прыладамі для арганізацыі чаю, гарачых сьнеданьняў, сталовак пры школах, абсталяваньнем рабочых пакояў па палітэхнізацыі. Усе гэтыя мерапрыемствы зацьверджаны РВК і перададзены райсаюзу і Белкаапсаюзу, а таксама адпаведным установам і арганізацыям для выкананьня. У маі месяцы пытаньне аб мерапрыемствах па ўсеагульным абавязковым навучаньні прапрацавана на РК КП(б)Б, на пленуме РВК, якія намецілі канкрэтныя задачы падрыхтоўкі да навучальнага году, усклаўшы адказнасьць на асобныя галіны падрыхтоўкі на пэрсанальна вызначаных асоб. Мерапрыемствы па ўсеагульным навучаньні на 1931-32 навучальны год абмеркаваны на пленумах сельсаветаў, сходах партячэек, у камсамоле, прафсаюзах, сярод рабочых, калгаснікаў і ўсяго працоўнага насельніцтва раёну.

У выніку сваячасова распачатай работы па падрыхтоўцы да 1931-32 навучальнага году па раёне прароблена:

1. Да 15-VI-31 г. праведзен дакладны вучот дзяцей узросту 8—11 год і падлеткаў 11—15 год. Да 15-VI усе школы 4-гадовыя і першыя канцэнтры 7-гадовых школ укамплектаваны вучнямі на 31-32 навучальны год і абвешчана ўсім вучням, што яны павінны зьявіцца на заняткі ў школу 1-IX-1931 г. Усяго па раёне з 1-IX будзе існаваць 69 школ, з іх 38 двухкамплектных, 26 аднакамплектных і 5 сямігадовых, сетка пашыраецца на 11 камплектаў. Агульны лік вучняў, якія будуць навучацца ў школах 1-га канцэнтру, складае 6.200 асоб. Існуючая ў раёне сетка 7-гадовых школ не дае магчымасьці ўвесьці ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе 7-гадовай школы. Усяго з масавай школы выпушчана ў 1930-31 нав. годзе 712 асоб, магчыма-ж прыняць у 5 групы існуючых 7-гадовых школ толькі каля 400 асоб. Перад 7-гадовымі школамі пастаўлена задача—стопроцантна ахапіць пятымі групамі скончыўшых у гэтым годзе масавую школу дзяцей рабочых, калгаснікаў і беднаты.

2. У раёне будуецца 6 двухкамплектных школ, з іх 4 заканчваюцца пабудовай да 1—15 верасьня г. г. і да 1-га кастрычніка. Да 1 верасьня заканчваецца пабудовай інтэрнат і кватэры для настаўнікаў новаадчыняемай Горкаўскай сямігадовай школы. Да гэтага-ж тэрміну заканчваецца пабудовай інтэрнат і памяшканьне для майстэрні Грабенскай ШКМ.

Пры Чэрвеньскіх сямігадовых школах абсталявана новая майстэрня. У гор. Чэрвені перабудавана былая царква ў кіно-тэатр, які адчынен у дзень вызваленьня БССР ад белапалякаў. Заканчваецца пераабсталяваньне былой царквы пад хату-чытальню ў вёсках Грабенцы і Раванічах. Распачынаецца прыстасаваньне былой сінагогі ў гор. Чэрвені пад інтэрнат з мэтай пазырэньня існуючага інтэрнату пры Чэрвеньскай ШКМ.

3. Укамплектаваньне школ настаўнікамі праведзена да 15 жніўня і выпікі ўкамплектаваньня зацьверджаны РВК. Вылучана 4 настаўнікі з першага канцэнтру на работу ў другі канцэнтр. Нехапае для другога канцэнтру 4 настаўнікі. Для масавай школы неабходна—49. На гэтую колькасьць настаўнікаў дана заяўка Наркамасьветы.

4. Заказана абсталяваньне для школ на суму 15.000 руб.

5. Аднак, ня гледзячы на праробленую працу па падрыхтоўцы да навучальнага году, правядзеньне 2 пакадніка штурму прарываў па падрыхтоўцы да новага навучальнага году, усё-ж з падрыхтоўкай да навучальнага году ня ўсё добра, а менавіта: да гэтага часу паступіла падручнікаў і навучальных прыладаў толькі на 2.000 руб. замест паказаных на 20 000 руб. Прылады для арганізацыі гарбаты, гарачых сьнеданьняў, сталовак пры школах у раён не паступаюць. Таксама справа абстаіць з абуткам, вопраткай, асьвятленьнем, шклом і матар'яламі для будаўніцтва і рамонту. Рамонт школьных будынкаў ідзе зусім марудна і нават ёсьць пагроза ў несваячасовым правядзеньні належнага рамонту.

Застаўшыяся 15 дзён да заняткаў, згодна пастановы РК КП(б)Б і РВК з удзелам раённай газэты «Калектывіст» і ўсёй грамадзкасьці ператвораны ў штурм прарываў у падрыхтоўцы да навучальнага году пад знакам поўнага выкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б, РК КП(б)Б і Райвыканкому, пад знакам—Чэрвеншчына павінна дабіцца атрыманьня ганаровага сьцягу ЦК КП(б)Б.

Штаб 2-га этапу культэстафэты.
Заг. Аргпропу РК КП(б)Б ГУТНЭР.
Інспэктар Нарасьветы ЗЕНЬКОВІЧ.

Гомель пачаў бой за суцэльную пісьменнасьць

Гомельскія гарком партыі і гарпрафсавет абвясьцілі штурм няпісьменнасьці з разьлікам, каб да 1 кастрычніка ператварыць Гомель у горад суцэльнай пісьменнасьці.

Становішча пісьменнасьці па Гомлі, у параўнаньні з мінулым годам, значна палепшылася. На прадпрыемствах засталося ня больш 1,5 проц. няпісьменных, якія складаюцца, галоўным чынам, з новага прыліву рабочых з вёскі.

Па ўсім горадзе няпісьменных налічваецца да 2—2,5 проц. з агульнага ліку насельніцтва. Нават разам з прыляталіцаю да Гомелю раёнам няпісьменных будзе ня больш 4,5 проц., таксім чынам маюцца добрыя ўмовы і магчымасьці Гомельскаму раёну стаць у хутчэйшы тэрмін суцэльна пісьменным.

На старонках «Палескай Праўды» фабрыкі і заводы заяўляюць аб сваім уключэньні ў штурм, аб праверцы сваіх радоў для выяўленьня няпісьменных, аб выкліках на сацспаборніцтва іншых прадпрыемстваў («Хлебазавод» выклікае «Палесдрук», «Пралетары», завод імя Ланцуцкага і г. д.), аб становішчы суцэльнай пісьменнасьці («Хлебазавод», «Чырвоны Хімік», «Пралетары» і інш.), аб далейшых мерапрыемствах па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў сем'яў рабочых (завод «Чырвоны Хімік»), аб падрыхтоўцы да зьлётаў культармейцаў і інш. і інш.

Па сёньняшні дзень толькі з дапрызыўнікамі (1909 г.) і сезоннікамі стала працуюць 39 ліквпунктаў, навучаецца 902 чал.

Ліквідацыя няпісьменнасьці на прадпрыемствах праходзіць пад лёзунгамі: «само прадпрыемства ліквідуе ў сябе няпісьменнасьць», «піводнага няпісьменнага ў брыгадзе».

Трэба ўсё-ж адзначыць, што Гомельскі штаб культэстафэты яшчэ не раскачаўся як сьлед, дабраахвотнае таварыства «П. Н.» ня ўдзельнічае зусім таму, што ячэйкі «П. Н.» пасьля ліквідацыі акругаў яшчэ не афармлены і ў Гомлі дагэтуль няма райсавету «П.Н.».

Брыгадзір НКА і «Сав. Беларусі»
Шалоніна.

Прыклад ударнай барацьбы з няпісьменнасьцю

Ячэйкай «П. Н.» Менскай 25-й ФЗС была прароблена вялікая работа па ліквідацыі няпісьменнасьці. Сіламі ячэйкі абслугоўвалася 10 ліквпунктаў, з якіх было выпушчана 240 чалавек ужо пісьменнымі людзьмі.

Такіх вялікіх посьпехаў ячэйка дамагалася дзякуючы добраму кіраўніцтву сакратара ячэйкі «П. Н.» настаўніцы—ударніцы тав. Курэк а таксама дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў гэтай працы настаўнікаў Цьвіркі, Матузавай, Ліхачовай, Вагнэр і Сакольскай, якія здолелі згрупаваць вакол сябе лепшы вучнёўскі актыў і скарыстаць яго на працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Да кожнай групы вучняў быў прымацаваны для мэтадычнай кансультацыі настаўнік, вучні складалі брыгады для самаправеркі, выклікалі адзін аднаго на сацспаборніцтва.

Цэнтральны Савет Т-ва «П. Н.» пастанавіў за ўдарную працу прэміяваць ячэйку «П. Н.» 25-й школы ФЗС.

Ячэйкі «П. Н.» Савецкай Беларусі, раўнайцеся па ўдарных тэмпах работы ячэйкі 25-й ФЗС г. Менску.

УДАРНІК.

Пазыка „3-ці рашаючы“ ў масы

Выраўнаць фронт падпіскі

Аднаасобны сэктар працягвае адставаць у рэалізацыі пазыкі на вёсцы

Сваячасова сабраць першы ўзнос!

Зрух ёсьць, але недастатковы

ГОМЕЛЬ, 15-VIII. (Наш кор.) У рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы» па вясковым сэктары адчуваецца некаторы пералом.

Вельмі значна ў гэтым дапамагаюць прадпрыемствы-шэфы гораду, якія высылкай рабочых брыгад у свае сельсаветы дабіваюцца добрых вынікаў рэалізацыі.

Камбінат «Спартак» па Прыбыткоўскім сельсавеце дабіўся, замест ранейшых 13 проц. выкананьня заданьня,—77 проц. Сельмаш па Ўрыцкім сельсавеце, замест ранейшых 9 проц.,—80 проц.

На сёньняшні дзень выкананьне заданьня па вясковым сэктары складае 58 проц. Ганебна цягнуцца ў хвасьце Бабавіцкі, Дзятлавіцкі, Баробінскі, Старамільчанскі сельсаветы.

14-га жніўня рапартаваў гаркому і «Палескай Праўдзе» аб выкананьні заданьня па пазыцы на 109 проц. Міхалькоўскі сельсавет.

Яўх. Рымэрман.

Падцягнуць аднаасобнікаў

Член рабочай брыгады НКФ сумесна з загадчыкам Крупінскай ашчадкасы аб'ехалі вёскі далучаныя да Крупскага раёну.

Работа па пазыцы ў гэтых вёсках праводзілася слаба, але ўсё-ж брыгада дабілася мабілізацыі камсамольскага актыву.

Ячэйка Смарадзінскага сельсавету выклікала на сацспаборніцтва ячэйку Абчугскага сельсавету. Ячэйкі абавязаліся разьмясьціць звыш пляну на 3000 руб.

Трэба адзначыць сьвядомыя адносіны да справы т. Шапіра—заг. Крупскай ашчадкасы, які паказаў прыклад ударнай работы. Брыгада ставіць пытаньне перад НКФ Беларусі аб яго прэміяваньні.

Падпіска сярод калгаснікаў слабая, усяго рэалізавана 15.000 руб. з заданьня 20.000 руб. Сярод аднаасобнікаў праведзена падпіска на 4000, а заданьне 86.000.

Ударнай работай, мабілізуючы вакол пазыкі партыйцаў, камсамольцаў і лепшых калгаснікаў трэба выканаць плян рэалізацыі пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Шырман.

Пра ход выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў у Кармянскім і Любаньскім раёнах

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае:

а) сыстэматычнае значнае недавыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў і зьніжэньне тэмпаў працы ў Кармянскім раёне (за I квартал—49,9 проц., за II квартал—46,9 проц., за III кварт. на 10-8—22,7 проц.). Такія ганебныя вынікі выкананьня пляну зьяўляюцца вынікам поўнай бязьдзейнасьці і апартуністычнай стаўкі на самацёк. Дырэктывы СНК БССР ня выконваюцца: выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў ня стала ў цэнтры ўвагі раённага выканаўчага камітэту; масавая арганізацыйна-агітацыйная работа не разгорнута; работа па выкананьні фінпляну да апошняга часу носіць кам пэнейскі характар і не ўвязваецца з іншымі палітычна-гаспадарчымі кампаніямі;

б) значнае паслабленьне работы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў у II квартале ў Любаньскім раёне (75,3 проц. у параўнаньні з 85,2 проц. у першым кварт. 1931 г. і 93,8 проц. у асобым квартале 1930 г.) і нездавальняючы ход выкананьня пляну III кварт. па звароту пазычак (на 10-VIII—23,5 проц. квартальнага пляну), па акцыях Трактарацэнтру (5 проц., па абавязнасьцях на сельскагаспадарчыя машыны (7,9 проц.), па ашчадкасе (21,3 проц.).

Бяручы пад увагу паказанае, СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Кармянскі і Любаньскі раённыя выканаўчыя камітэты па працягу жніўня м-ца поўнасьцю ліквідаваць дапушчаныя прарывы ў пляне мабілізацыі сродкаў, у паасобку:

а) зараз-жа разгарнуць масавую растлумачальную работу па датэрміновым паступленьні абавязковых плацяжоў на вёсцы.

Абавязкова забясьпечыць спагнаньне плацяжоў з кулацкіх гаспадарак на працягу жніўня м-ца;

б) неадкладна разгарнуць работу па правядзеньні самаабкладаньня з тым, каб плянавае заданьне на III квартал было абавязкова выканана;

в) дабіцца поўнага выкананьня заданьня па рэалізацыі пазыкі, скончыўшы ў дэкадны тэрмін афармленьне падпіскі, забясьпечыць паступленьне чарговых узносаў і поўны ахоп падпіскаю ўсіх працоўных, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на рэалізацыю пазыкі на вёсны праз пазыку для дапамогі сельскім саветам адказных працаўнікоў раённага апарату, праз шырокае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і скарыстаньне ўдарных калгасных брыгад;

г) зьвярнуць асаблівую ўвагу на рэалізацыю акцый Трактарацэнтру і абавязнасьцяй на сельскагаспадарчыя машыны;

д) у бліжэйшыя-ж дні забясьпечыць разгортваньне паводле пляну сеткі ашчадных кас і ўкамплектаваць іх адпаведнымі працаўнікамі.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР спыніць выдачу датацыі Кармянскаму раёну за зрыў выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў да поўнага пералому ў працы па мабілізацыі сродкаў.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, Белкаапсаюзу і Белсельгасснабу пры разьмеркаваньні тавараў паміж раёнамі ўлічваць выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, скарачаючы завоз тым раёнам, якія зрываюць пляны мабілізацыі сродкаў, і адначасова павялічыць тым раёнам, якія добра выконваюць гэтыя пляны.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

15 жніўня 1931 г.
г. Менск.

У бой за торф

Кругласутачную працу

фрэзэраў—на поўны ход!

Апошнія дні сэзону ператварыць у дні штурмавой барацьбы за торф

За шыльдай об'ектыўных прычын

Торфзавод імя Даўмана закончыў сэзон з вялікімі прарывамі. Сэзоннае заданьне на 11-га жніўня выканана на 44 проц.

Заводакіраўніцтва, тарфком, ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМ знаходзяць цэлы рад аб'ектыўных прычын. Але-ж сапраўдныя прычыны правалу наступныя: на заводзе поўная абязьлічка, няма ніякай адказнасьці тэхнічных працаўнікоў за паасобныя галіны вытворчасьці. Заводакіраўніцтва толькі ў габінэтах марыць аб пераходзе заводу на гаспадарчы разьлік, але ня робіць нічога канкрэтнага.

Цэхі, агрэгаты, брыгады на гаспадарчы разьлік не пераведзены. Мэханічны цэх злачынна зрывае работу машын. Па віне мэханіка Рабушава фармовачная машына стаяла 8 гадзін таму, што люк несваячасова адраманцаваны. Такіх выпадкаў дзесяткі.

Яшчэ да гэтага часу для носкі торфу не прыстасаваны насілкі, козлы. Сушка торфу, не адпавядае тэхнічным запатрабаваньням, ад чаго каштоўны матар'ял псуецца ў вялікай колькасьці.

Старшыня тарфкому Шацкін ня ведае, што робіцца на балоце. Ён ня ведае, што тарфком таксама зьяўляецца вінаўнікам у невыкананьні прамфінпляну. Тарфком ня ўлічыў, што большасьць рабочых прыйшла з вёскі і мае зачастую рвацкія настроі.

Заводзкі трыкутнік павінен перабудаваць сваю работу. Дні, якія засталіся павінны зрабіцца пераломнымі. Завод імя Даўмана не павінен цягнуцца ў хвасьце іншых торфазаводаў, ён павінен свае пляны выконваць і перавыконваць з тым, каб патрэбную колькасьць тон апалу сваячасова даць прамысловасьці.

Х. К—оў.

За чоткую клясавую лінію ў падатковай рабоце

Бабруйскі, Жлобінскі і Гародоцкі раёны яшчэ не налічылі падаткаў і страхоўкі, не раздалі сялянству акладных лістоў

„Таварышы, я прашу вас узяць пытаньні фінансавага пляну пад свой бальшавіцкі, рабселькораўскі нагляд... узяць увесь фінансавы апарат пад абстрэл рабселькораўскай крытыкі, дапамагчы нам вытравіць усе апартуністычныя..., няздольныя элемэнты...“ (Грынько)

Ліквідаваць прарыў

правільна ўлічыць аб'екты абкладаньня

Сельска - гаспадарчы падатак зьяўляецца магутным падважнікам калектывізацыі. Сёлетні закон пра сельгаспадатак пабудован такім чынам, каб яшчэ больш заахвоціць бяднацка-серадняцкае сялянства да ўступленьня ў калгасы, яшчэ раз паказаць апарату калектывізаванай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай гаспадаркай. Гэта дасягаецца шляхам прадстаўленьня раду буйных льгот калгасам. Добра праведзеная работа па папулярызацыі закону пра сельгаспадатак дала значны зрух у калектывізацыі. Гэта надзвычай на яскрава пацьвярджаецца наступнымі лічбамі.

Калі да пачатку ўліку аб'ектаў абкладаньня сельгаспадаткам па БССР было калектывізавана бядняцка-серадняцкіх гаспадарак каля 23 проц., дык гэта лічба да канца ўліку аб'ектаў, гэта зн. на 1 ліпеня дасягнула звыш 40 проц.

Улік аб'ектаў абкладаньня зьяўляецца фундамантам усёй кампаніі па сельгаспадатку. Бо ў залежнасьці ад паўнаты і правільнасьці ўліку аб'ектаў залежыць правільнае і клясава-вытрымнае разьмеркаваньне падатку паміж асобнымі сацыяльна - эканамічнымі групамі вёскі.

Аднак, дзякуючы недаацэнцы гэтай справы, адсутнасьці належнага кіраваньня, шырокай растлумачальнай работы, адсутнасьці фактычнай праверкі вынікаў вучоту, атрымаўся вялікі прарыў па некаторых раёнах.

Значнае памяншэньне коняй супроць леташняга па Смалявіцкім раёне на 23,1 проц., Капыльскім—на 20,4 проц., Чырвона-Слабодзкім — на 18,2 проц., значнае памяншэньне кароў па Смалявіцкім раёне — на 20,5 проц., Плешчаніцкім — на 16 проц., Вушацкім - на 14,7 проц., памяншэньне авечак па Плешчаніцкім раёне—на 33,6 проц., Церахоўскім на 27,9 проц., Уваравіцкім—на 23,6 проц., Вушацкім на 23,1 пр., Пухавіцкім—на 21,7 проц., Нараўлянскі—на 20,9 проц. Нават мяецца памяншэньне заработкаў па Мсьціслаўскім раёне на 11,4 проц. і Талачынскім—на 7,1 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб недбайнасьці раённых арганізацый перадлічаных раёнаў да важнейшай гаспадарча-палітычнай справы.

Ніколі, нідзе не гаварылася і не пісалася аб гэткіх нячуваных лічбах памяншэньня жывёлы. Тут, бязумоўна, мае месца значна затойка жывёлы. Тое-ж самае трэба сказаць і аб заработках. Дзяржава выдаткоўвае мілярды на пабудову сацыялістычнай гаспадаркі, пры чым надзвычайна значныя сумы выплачваюцца сялянству за розныя работы, а Мсьціслаўскі і Талачынскі раёны ўхітрыліся нават паказаць, што разьмеры заработкаў з кожным годам памяншаюцца.

Неадкладна ўручыць акладныя лісты

Уся праца па ўліку аб'ектаў, налічэньні падаткаў і ўручэньні платнікам акладных лістоў павінна была быць скончана да 15 ліпеня. Аднак, па большасьці раёнаў гэта дырэктыва ня выканана.

Калі на 1 жніўня амаль па ўсёй БССР былі ўручаны платнікам акладныя лісты, дык Гарадоцкі, Бабруйскі і Жлобінскі раёны нават улік аб'ектаў ня скончылі, не гаворачы аб налічэньні падатку і ўручэньні акладных лістоў.

Раённыя арганізацыі паказаных раёнаў з самага пачатку падатковай кампаніі, спадзяючыся на самацёк, палец аб палец ня ўдарылі, каб забясьпечыць посьпех кампаніі. Усю працу ўзвалілі на сельсаветы, не аказаўшы ім ніякай дапамогі. Раённыя ўпаўнаважаныя лічыліся на паперы. У раёне нават і на сёньняшні дзень ня ведаюць аб выніках праведзенай работы.

Адным словам, гэтыя раёны злосна і сумленна правалілі кампанію па сельгаспадатку. Органы КК-РСІ і пракуратуры павінны зараз-жа праверыць і выявіць канкрэтных посьбітаў зла.

Калгасьнікі павінны атрымаць ільготы, дадзеныя ўрадам

Маючыя-ж весткі сьведчаць аб тым, што закон пра сельгаспадатак ня ўсюды добра праводзіцца. Наглядаюцца выпадкі, што калгасьнікам па іх неабагуленых даходах не прадастаўлены прадугледжаныя законам ільготы. У калгасьнікаў, напрыклад, нават былі ўлічаны і абкладзены кан'юнктурныя даходы. (Аршанскі, Гарадоцкі раёны). Ёсьць таксама выпадкі, што беднякі, якія летась вызваляліся ад падатку, а сёлета ўступілі ў калгас, абкладзены падаткам (Гарадоцкі раён). Справе вызваленьня некалектывізаванай беднаты—будучых калгасьнікаў на мясцох не ўдзяляюць належнай увагі. Часта зусім ігнаруюць існуючыя ўстаноўкі ў гэтым пытаньні, разважаючы, што некага вызваляць ад падатку. Гэткія размовы і разважаньні нічога агульнага з лініяй партыі ня маюць. Сапраўдная некалектывізаваная беднота павінна быць вызвалена ад падатку.

Абкладаньне ў серадняцкіх гаспадарак кан'юнктурных даходаў мае на мэце садзейнічаць нашым загатоўкам, пры чым гэткія даходы абкладаюцца толькі ў тых гаспадарках, якія іх сяпраўды мелі, і ад продажу тых прадуктаў, па якіх гаспадарка ня мела або ня выканала цьвёрдага заданьня ці кантрактацыйнага дагавору па загатоўках.

Выяўленьне гаспадарак з гэткімі даходамі павінна праводзіцца пры шырокім удзеле грамадзкасьці. Аднак, часта гэта праца праводзіцца габінэтным парадкам, у выніку чаго па некаторых раёнах абкладзена з кан'юнктурнымі даходамі аж да 60 проц. усіх гаспадарак, а па іншых раёнах толькі 4 проц. гаспадарак. (Дрыса, Старыя Дарогі, Церахоўка, Бялынічы і інш.).

У Гарадоцкім раёне, напрыклад, гаспадаркі з кан'юнктурнымі даходамі і разьмеры гэтых даходаў зусім не зацьвярджаліся райпадатковай камісіяй, прычым ва ўсіх выпадках гэтыя даходы ўлічаны да абкладаньня ў разьмеры 100 проц. нават і тады, калі гэтага па закону нельга было зрабіць, у выніку прышлося забіраць у плятнікаў акладныя лісты і пералічаць ім падатак.

Выяўленьне кулакоў і іх даходаў для індывідуальнага абкладаньня праходзіць таксама нездавальняючэ. Паўтараецца леташняя практыка, калі з пачатку кампаніі па раду раёнаў ня было выяўлена ні адна кулацкая гаспадарка, а па некаторых былі выяўлены па 1-2 гаспадаркі. Зусім зразумела, што гэткія паводзіны зьяўляюцца зусім недапушчальнымі. На вялікі жаль, на гэты шлях сёлета сталі Плешчаніцкі, Крычаўскі, Вузьдзенскі, Быхаўскі, Клімавіцкі і Чэрыкаўскі раёны.

Апартунізм прывёў да прарыву

Па пляну мабілізацыі сродкаў у ліпені м-цы павінна было паступіць ня менш 10 проц. гадавой сумы падатку (1.300 тысяч рублёў). Але з-за непаваротлівасьці раённых арганізацый, заданьне ганебна правалена: на 1-е жніўня паступіла толькі 383 тыс. руб. або 29,5 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што праца за датэрміновую выплату падатку не разгорнута. Падатак паступае самацёкам. Гэткія апартуністычныя тэмпы пагражаюць невыкананьнем квартальнага заданьня, гэта значыць ня менш 60 проц. гадавой сумы падатку і страхоўкі.

З гэтых раёнаў не паступіла ніводнай капейкі падатку

Па 9 раёнаў не паступіла ніводнай капейкі падатку. (Бабруйскі, Жлобінскі, Бешанковіцкі, Буда-Кашалёўскі, Глускі, Капыльскі, Касьцюковіцкі, Краснапольскі, Лельчыцкі).

Па 17 раёнах паступіла менш як 1.000 руб. (Вушацкі—21 руб., Уваравіцкі—26 руб., Чашніцкі—23 руб., Полацкі—146 руб. і г. д.):

Раённыя арганізацыі 50 раёнаў праяўляюць надзвычайную літасьць да кулакоў, не спагнаўшы з іх да гэтага часу ні аднэй капейкі.

Кулакі беспакарана разбазарываюць сваю маемасьць, а сельсаветы і райвыканкомы стаяць у баку як прыватныя гледачы.

Нават з калгасаў 65 раёнаў не паступіла ні аднэй капейкі падатку.

Аб чым сьведчаць гэтыя агідныя факты, калі не аб выключнай нядбайнасьці, непаваротлівасьці, надзеі на самацёк раённых арганізацый і фінансавага апарату ў першую чаргу.

Пералічаныя факты патрабуюць рашучага выпраўленьня ўсіх недахопаў і ліквідацыі прарываў. Закон пра сельгаспадатак зьяўляецца сугуба клясавым.

Раённыя арганізацыі і фінансавы апарат у першую чаргу пры дапамозе грамадзкасьці, ужыўшы сацыялістычныя мэтады працы, павінны забясьпечыць чоткае, клясава-вытрыманае правядзеньне сельгаспадатку.

Трэба зараз-жа перабудаваць працу раённых арганізацый і сельсаветаў на ўдарныя, сапраўды бальшавіцкія тэмпы працы, забясьпечваючы 100-процантнае выкананьне плянавых заданьняў па зборы абавязковых плацяжоў на вёсцы. Неадкладна спагнаць увесь недабор, які меўся ў ліпені і першай палове жніўня месяца.

Толькі так, а ня інакш, павінна быць вырашана пытаньне.

Па апартуністых, зрыўшчыках пляну мабілізацыі сродкаў павінен быць зроблен рашучы ўдар.

Март.

Чаму ня выканана пастанова сельсавету?

У 1930-31 г. пры вучоце аб'ектаў абкладаньня па Грабаўскім сельсавеце, Гомельскага раёну, сельскай падатковай камісіяй на чале з старшынёю тав. Башлаковым Адамам была наўмысьля не даўлічана 3.000 руб. прыбытку. Значная частка гэтых грошай прыпадае на сялянина вёскі Грабакоўкі Башлакова Ягора, які па дагавору дастаўляў скрыні на шчацінную фабрыку «Чырвоны Кастрычнік».

З фабрыкі неаднаразова паведамлялася, у Грубаўскі сельсавет, аб тым, што Башлакоў Ягор атрымаў больш як 5.000 руб. грошай. З гэтай лічбы Грабаўская падатковая камісія частку грошай улічыла, а астатняя частка наўмысьля камісіяй няўлічана.

У свой час у Грабаўскі сельсавет аб гэтым былі пададзены заявы. Два разы на прэзыдыуме сельсавету ставілася гэтае пытаньне, але ня гледзячы на ўсё гэта грошы і да гэтага часу ня ўлічаны і ўся справа схавана пад сукно.

Аб гэтым, ужо пісалася і ў Грабаўскай насьценгазэце, але-ж ніхто на гэта не зьвярнуў ніякай увагі.

Ведалі аб гэтым таксама сакратар Грабаўскай ячэйкі КП(б)Б тав. Меркуль, які быў у той час ўпаўнаважаным, і старшыня падатковай камісіі тав. Башлакоў Адам. Гэтыя два таварышы фактычна змазалі ўсю справу, прапусьціўшы пастанову прэзыдыуму сельсавету міма вушэй.

Трэба знайсьці вінаватых і прыцягнуць іх да адказнасьці.

Партызан.

Бярэце прыклад

МАГІЛЕЎ. (Белта). Па Магілеўскім раёне распачалася масавая датэрміновая здача сельгаспадатку. Сьледам за Пашкаўскім сельсаветам разгарнулі шырокую растлумачальную работу па датэрміновай здачы Гаранскі і Палыкоўскі сельсаветы. На аснове

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

па дакладу Наркамправы БССР аб уцягненьні жаночай працы ў вытворчасьць

Заслухаўшы даклад Наркамправы БССР аб становішчы уцягненьня жаночай працы ў прамысловасьці і іншыя галіны народнай гаспадаркі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае, што буйны рост прамысловасьці ў БССР, рэарганізацыя сельскай гаспадаркі на социялістычных падставах, пераход прамысловасьці і транспарта на сямігадзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень, далі магчымасьць Беларускай ССР, як і ўсяму Саюзу ССР, поўнасьцю ліквідаваць беспрацоўе. Задача забясьпечаньня народнай гаспадаркі рабочай сілай набывае вялізарнейшае значэньне. У гэтых умовах, як гэта адзначыла III Сэсія ЦВК Саюзу ССР, асаблівая ўвага павінна быць зьвернута уцягненьню жанчын у вытворчую дзейнасьць і падвышэньню іх кваліфікацыі.

Ня гледзячы, аднак, на паказаную дырэктыву Сэсіі ЦВК Саюзу ССР, а таксама пастановы Ураду БССР, да гэтага часу Наркаматы, ведамствы і арганізацыі БССР, у тым ліку і органы працы і прафэсыянальныя арганізацыі, ня ўжылі належных захадаў для арганізацыі скарыстаньня жаночай рабочай сілы. Удзельная вага жаночай рабсілы недастаткова і зусім нездавальняюча становішча па тых галінах народнай гаспадаркі, ў якіх раней жаночая праца ўжывалася ў абмежаванай колькасьці. У прыросьце рабочай сілы ўдзельная вага жаночых таксама недастаткова.

2. Па ВСНГ ёсьць значнае адставаньне росту жаночай рабсілы ў некаторых галінах прамысловасьці (метала апрацоўчая, скурана-абутковая, дрэва-апрацоўчая) і, нават, зьніжэньне ўдзельнай вагі жанчын у пассобных галінах (керамічная, хэмічная), адсутнічае плянава-арганізаваны набор рабсілы з ліку сямей рабочых, занятых на вытворчасьці. Пляны падрыхтоўкі жаночых кадраў праз усю сыстэму дадатковай рабочай асьветы ні ў ВСНГ, ні па аб'яднаньнях не прапрацоўваліся.

3. У большасьці наркаматаў, ведамстваў і арганізацый ўнядрэньне жаночай працы ня мае плянава-арганізаванага характару і ў гэтай справе існуе самацёк, а ў некаторых ведамствах і арганізацыях зусім адсутнічае плянаваньне і вучот жаночай рабсілы (Белдортранс і інш.), адсутнічае работа ў пастаноўцы і вырашэньні праблемы замены мужчынскай рабочай сілы жаночай па цэламу шэрагу прафэсій.

4. Адсутнічае плянава-арганізаваная перасоўка жанчын на больш кваліфікаваныя работы і сыстэматычнае падвышэньне іх кваліфікацыі, амаль што адсутнічаюць жаночыя кадры сярод рабочых высокай кваліфікацыі і нізкай зьяўляецца ўдзельная вага жанчын сярод рабочых сярэдняй кваліфікацыі. Навучальныя ўстановы і курсаваньне сыстэма ведамствамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі камплектуюцца жаночым кантынгэнтам недастаткова, вызначаны процант жанчын ня выконваецца, таксама нездавальняюча прасоўваюцца жанчыны ў вышэйшыя сярэднія навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі кваліфікаваных інжынэрна-тэхнічных кадраў.

5. З боку Наркамправы, райвыканкомаў і саветаў ня было дастатковага кантролю і праверкі за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду па ўнядрэньню жаночай працы ў народную гаспадарку і ня было праяўлена належнай настойлівасьці ў справе забясьпячэньня ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў.

Ня гледзячы на тое, што асноўныя жаночыя кадры рабочых зьяўляюцца маладымі кадрамі—культурна-масавая выхаваўчая праца сярод жанчын пастаўлена зусім слаба. Прадпрыемствы гэтай работе не ўдзяляюць належнай увагі.

Лічучы такое становішча ўнядрэньня жаночай працы ва ўсе галіны народнай гаспадаркі недапушчальным, і ў мэтах забясьпячэньня ў далейшым максымальнага шырокага ўдзелу працоўных жаночых рэзэрваў па ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць ВСНГ, Наркамзему, Наркамснабу, усім іншым наркаматам, цэнтральным установам і аб'яднаньням БССР у працягу месяцу праверыць выкананьне плянаў уцягненьня ў 1931 годзе жаночай працы ва ўсе га галіны народнай гаспадаркі БССР і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па выкананьні і перавыкананьні гэтых плянаў, пракарэктаваўшы іх у бок максымальнага павялічэньня жаночай праслойкі сярод рабочых высокіх і сярэдніх кваліфікацый.

2. Абавязаць Наркамправы разам з ЦСПСБ і зацікаўленымі ведамствамі распрацаваць спэцыяльныя пляны арганізаванага ўцягненьня жаночай рабсілы і пляны перасоўваньня, падвышэньня кваліфікацыі, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі жаночай рабсілы.

3. Наркамправы, НКАсьветы, ВСНГ, НКЗему, НКФіну і іншым цэнтральным установам, якія маюць у сваім веданьні навучальныя ўстановы, распрацаваць мінімальны процант уцягненьня жанчын у сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы ў адносінах да агульнага ліку навучаючыхся ў гэтых навучальных установах.

4. Прапанаваць усім наркаматам, цэнтральным установам, гаспадарным аб'яднаньням і прадпрыемствам пры камплектаваньні фабрычна-заводзкога вучнёўства і розных курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кваліфікаваных рабсілы забясьпечыць установлены Наркамправы процант жаночай праслойкі.

5. З прычыны адсутнічаньня ў існуючых формах перыясковай справаздачнасьці на прадпрыемствах паказальнікаў па жаночай працы, прапанаваць Дзяржпляну і Наркамправы БССР па ўзгадненьні з НК РСІ у 2-х дэкадны тэрмін распрацаваць формы сыстэматычнага вучоту ўнядрэньня і скарыстаньня жаночай працы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі БССР.

6. Улічваючы, што асноўнай перашкодай для масавага ўнядрэньня жаночай працы ў вытворчасьць зьяўляецца недастатковае разгортваньне сеткі культурна-бытавых устаноў, у першую чаргу ясьляй, дзіцячых садоў, сталовак, пральняў, прапанаваць Дзяржпляну праверыць і забясьпечыць выкананьне пляну разьвіцьця сеткі паказаных культурна-бытавых устаноў у 1931 годзе і пры распрацоўцы кантрольных лічбаў і народнагаспадарчага пляну на 1932 год, ужыць захады да максымальнага разьвіцьця гэтых мерапрыемстваў у адпаведнасьці з вызначанымі плянамі ўнядрэньня жаночай працы ў народнай гаспадарцы БССР.

7. Прапанаваць Райвыканкомам і Гарсаветам прыняць непасрэдны актыўны ўдзел у максымальным пашырэньні сеткі культурна-бытавых устаноў для абслугоўваньня жанчын-работніц, праводзіць сыстэматычны кантроль над выкананьнем дырэктыў па ўнядрэньні жаночай працы па ўсіх галінах народнае гаспадаркі, прымаючы рашучыя меры па выкананьні і перавыкананьні вызначаных плянаў па ўнядрэньні жанчын у вытворчасьць.

8. Даручыць Дзяржпляну і НКПрацы БССР пры распрацоўцы кантрольных лічбаў працы на 1932 год адбіць у іх у канкрэтнай форме (у лічбах) усе тыя мерапрыемствы, якія вынікаюць з гэтай пастановы, і падаць СНК адпаведны даклад аб пляне ўнядрэньня жаночай працы ва ўсе галіны народнай гаспадаркі БССР на 1932 год.

Ч. в. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гіляжкевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

5 жніўня 1931 г.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб рабоце Цэнтральнага Дому Селяніна

Заслухаўшы даклад Загадчыка цэнтральнага дому селяніна тав. МІЦЬКЕВІЧА і садаклад Інструктара Арганізтру Прэзыдыуму ЦВК тав. ЗЯНКЕВІЧ аб рабоце Цэнтральнага дому селяніна, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае:

1. Да гэтага часу зусім не перабудавана работа Цэнтральнага дому селяніна ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Пастанова Сакратарыяту ЦВК БССР за 11-IV—31 г. аб палепшаньні работы Дому селяніна ў значнай меры не выканана.

Цэнтральны дом селяніна зусім слаба праводзіў масава-прапагандыцкую работу, за социялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, за разгортваньне калгаснага руху, за правільную пастаноўку работы і арганізацыю працы ў калгасах, за пераход на зьдзельшчыну.

2. За ўвесь час свайго існаваньня Цэнтральны дом селяніна ня здолеў зьвязацца з дамамі селяніна ў раёнах і не дапамагае ім у наладжваньні работы.

3. З боку НК Асьветы ня ўжыты належныя захады для пастаноўкі палітыка-выхаваўчай работы ў Доме селяніна.

4. Зусім недапушчальным зьяўляецца тое, што Цэнтральны дом селяніна, ня гледзячы на пастановы Прэзыдыуму ЦВК і ЦК УсеКП(б), да гэтага часу працягвае скарыстоўвацца не па прызначэньні (над установы, кватэры).

Выходзячы з вышэйадзначанага Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць НКЗему, Калгасцэнтру і НК Асьветы ўзмацніць кіраўніцтва Цэнтральным домам селяніна, перабудаваўшы яго работу такім чынам, каб Дом селяніна стаў сапраўдным прапагандыстам усіх мерапрыемстваў партыі і савецкай улады па ажыцьцяўленьні сацыялістычнага будаўніцтва, як-та: ажыцьцяўленьне суцэльнай калектывізацыі, лепшая пастаноўка працы ў калгасах, ужываньне сацыялістычных мэтадаў і форм працы—ударніцтва і сацспаборніцтва, пераход на зьдзельшчыну ў саўгасах і калгасах, падняцьце ўраджайнасьці і правільнае разьмяркаваньне ўраджаю, шляхам выяўленьня вопыту работы лепшых саўгасаў і калгасаў і папулярызацыі гэтага вопыту, аўладаньне тэхнікай, і інш.

2. Работу Цэнтральнага дому селяніна перабудаваць так, каб ён сваім вопытам і прыкладам паказальнай работы сапраўды дапамагаў дамам селяніна ў раёнах наладзіць работу па барацьбе за социялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

3. Загадчыку цэнтральнага дому селяніна сумесна з ЦСПСБ устанавіць сталую сувязь прафсаюзных арганізацый з дамамі селяніна ў мэтах узмацненьня сувязі і пралетарскага ўплыву на калгасныя і бядняцка-серадняцкія сялянскія масы, якія праходзяць праз дамы селяніна.

4. Прапанаваць усім наркаматам і іншым цэнтральным установам, якія зьвязаны ў сваей рабоце з абслугоўваньнем патрэб вясковага працоўнага насельніцтва (НКЗем, Белкалгасцэнтр, НКФін, Белдзяржснаб, НК Асьветы і інш.) устанавіць сталае дзяжурства адказных работнікаў у Цэнтральным доме селяніна ў мэтах набліжэньня і палепшаньня абслугоўваньня прыяжджаючых з вёскі ў горад сялян. Незалежна ад гэтага вылучаць сыстэматычна спэцыялістаў для праезджаньня розных гутарак па спэцыяльных пытаньнях.

5. Пры правядзеньні культ-масавай работы ў дамох селяніна асаблівую ўвагу зьвярнуць на лепшую пастаноўку інтэрнацыянальнага выхаваньня, абслугоўваючы наведвальнікаў і нацменшасьці газэтамі, кнігамі і праводзячы работу на іх роднай мове.

6. Прапанаваць Загадчыку Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК устанавіць сталую сувязь з Цэнтральным домам селяніна.

7. У мэтах лепшага культабслугоўваньня наведвальнікаў Цэнтральнага дому селяніна шырока выкарыстоўваць такія сродкі як кіно, радыё і інш. мастацкай формы работы: дэкламацыя, музыка, прыцягваючы да гэтай справы Наркамасьветы, Радыёцэнтр і Белдзяржкіно.

8. Вылучыць адказную асобу за работу сярод жанчын, якой арганізаваць работу ў напрамку ўцягненьня жанчын у калгасны рух, палітычнага і культурнага выхаваньня, арганізацыі жаночай працы, бытавога абслугоўваньня ў саўгасах і калгасах і г. д.

9. Даручыць НК РСІ праверыць асабовы склад работнікаў Цэнтральнага дому селяніна ў мэтах замены неадпавядаючых работнікаў, шляхам вылучэньня на адказныя работы ў Доме селяніна лепшых ударнікаў і ўдарніц, рабочых работніц МТС і саўгасаў, калгасьнікаў і калгасьніц.

10. Рашуча спыніць выпадкі скарыстаньня дому селяніна не па простым прызначэньні (скарыстаньне пад кватэры і розныя броні для камандыровачных).

11. Прапанаваць Райвыканкомам і саветам праверыць становішча дамоў селяніна на мясцох, заслухаць на сваіх паседжаньнях адпаведныя даклады дамоў селяніна і вызначыць мерапрыемствы для палепшаньня іх работы.

12. Заслухаць праз 3 месяцы на пасяджэньні Сакратарыяту ЦВК БССР даклад Цэнтральнага Дому селяніна аб выкананьні гэтай пастановы.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гіляжкевіч.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **Б. Вансоўскі.**

5 жніўня 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра выкананьне дырэктыў аб выданьні і распаўсюджваньні сельскагаспадарчай літаратуры да асеньняй пасеўнай кампаніі

Выслухаўшы даклады прадстаўнікоў Беларускага дзяржаўнага выдавецтва т. Няміра і Беларускага каапэрацыйнага аб'яднаньня культтавараў т. Прылуцкага і садаклад прадстаўніка НК РСІ т. Вароніна аб выданьні і распаўсюджваньні сельскагаспадарчай літаратуры да асеньняй пасеўнай кампаніі, Камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што:

а) пастанова ЦК КП(б)Б за 8 чэрвеня аб карэннай рэарганізацыі сеткі кнігараспаўсюджваньня і аб палепшаньні справы выданьня сельскагаспадарчай літаратуры ня выканана. Уся рэарганізацыя сеткі выявілася ў вылучэньні з апарату Белкаапсаюзу самастойнага аб'яднаньня культтавараў і ў прыёме гэтым аб'яднаньнем 21 кнігарні Белкаапсаюзу без усякіх зьмен у сетцы;

б) выданьне сельскагаспадарчай літаратуры да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі праводзілася без дастатковага планаваньня, у выніку чаго не выдадзены вельмі патрэбныя кнігі па апрацоўцы глебы пад азімыя, па ворыве на зяб, мэханізацыі вытворчых працэсаў, сіласаваньні кармоў, змаганьні са шкоднікамі, а кнігі па зьдзельшчыне ў калгасах і арганізацыі ўборкі вышлі са спазьненьнем;

в) выдадзеная да асеньняй пасеўнай кампаніі літаратура ў значнай частцы не прасунута да кнігарняў.

Бяручы пад увагу паказанае, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць кіраўніка беларускага аб'яднаньня культтавараў тав. Бароўскага і загадчыка беларускага дзяржаўнага выдавецтва тав. Некрашэвіча не пазьней як праз 10 дзён:

а) падаць у СНК праект пастановы аб перабудаваньні сеткі кніга распаўсюджваньня паводле пастановы ЦК КП(б)Б;

б) з літаратуры, якая яшчэ не даведзена да спажыўца, прасунуць 75 проц. у кнігарні Белкаапсаюзу і 25 проц. у кнігарні Беларускага дзяржаўнага выдавецтва.

2. Даручыць беларускаму дзяржаўнаму выдавецтву пераглядзець дагаворы з аўтарамі з тым, каб была павялічана адказнасьць за несваячасовую здачу рукапісаў, а таксама ўжыць захады да скарачэньня тэрміну афармленьня выданьняў навукова-папулярнай кнігі ў апараце Беларускага дзяржаўнага выдавецтва да 5 дзён.

3. Даручыць Беларускаму дзяржаўнаму выдавецтву разам з Народным Камісарыятам Земляробства забясьпечыць больш поўнае прыцягненьне да пісаньня кніг па сельскай гаспадарцы спэцыялістаў, якія беспасрэдна працуюць у калгасах, саўгасах і машына-трактарных станцыях, а таксама перадавых рабочых саўгасаў, машына-трактарных станцый, калгасьнікаў і інш.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **К. Бэнэк.**

Сакратар камісіі Выкананьня пры СНК БССР **Я. Элькін.**

10 жніўня 1931 г.
Менск.

Уключыць КСУ ва ўборачную

Ператварыць працдружыны КСУ ва ўдарныя брыгады ўборачнай. Ліквідаваць дэмобілізацыйныя настроі КСУ Слуцкага раёну

За рашучую перабудову і актывізацыю работы КСУ

Магутны ўздым калгаснага руху, рост актыўнасьці і сьвядомасьці калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, звужэньне з кожным днём адналасобнага сэктару ў сельскай гаспадарцы, рашучы наступ на кулака і яго ліквідацыя як клясы на падставе суцэльнай калектывізацыі, патрабуюць ад усёй сыстэмы камітэтаў сялянскай узаемадапамогі напружнай дзейнасьці і перабудовы ўсяе работы камітэтаў у тым напрамку, каб на пачатках самадзейнасьці калгасных мас работу КСУ накіраваць на ўзаемадапамогу калгаснаму сэктару.

Адпаведна з гэтымі новымі задачамі, зараз падрыхтоўваецца законапраект аб арганізацыі ў тых раёнах, дзе калгасны рух перавышае 60 проц. пры калгасах кас узаемадапамогі калгаснага сялянства.

Такім чынам, перад арганізацыямі КСУ становіцца адказная задача перакаючэньня і перабудовы работы тварам да калектывізацыі. Але гэта ні ў жім разе не дае права сыстэме КСУ на дэмабілізацыйныя, а ў асобных выпадках і ліквідацыйныя настроі, як гэта між іншым робіцца па радзе раёнаў. Наадварот, ад арганізацый КСУ патрабуецца ўпартая настойлівая работа па перабудове работы на лепшае абслугоўваньне працоўных калгасных і аднаасобных мас сялянства.

Аднак, на сёньняшні дзень мы маем прыклады развалу асобных камітэтаў, перакіданьня работнікаў КСУ на іншыя работы, адсутнасьць кіраўніцтва КСУ з боку раённых і сельсавецкіх арганізацый, наяўнасьць растрат у арганізацыі, нерэагаваньне на гэтыя зьявішчы і г. д.

Рад камітэтаў зусім спынілі работу па зборы ўзносаў як грашовых так і натурай.

Такое становішча надалей ад можа быць цярпімым і патрабуе ад арганізацый КСУ, а таксама і ад кіруючых раённых і сельсавецкіх арганізацый рашучай перабудовы і актывізацыі работы арганізацый КСУ, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарництва ў арганізацыі КСУ, рашучай барацьбы супроць бюракратызму і разгортваньня базьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкі.

Усю дзейнасьць КСУ трэба падпарадкаваць ўцягненьню бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы. Трэба забясьпечыць сталую работу груп беднаты і наогул работу з беднатой з тым, каб арганізаваць яе для ўступленьня ў калгасы. Пры гэтым КСУ павінны актыўна ўдзельнічаць у барацьбе супроць кулацтва.

Асабліва востра зараз стаіць пытаньне аб арганізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў на ўдарнае разгортваньне ўборачнай і падрыхтоўцы асеньняй сяўбы, збор с.-г. падатку, грашовых і натуральных узносаў па лініі КСУ, актыўнае сяўдзейнічаньне хлебазагатоўкам, распаўсюджваньню пазыкі «3-ці рашучых», збор сродкаў на самалёт «Узаемадапамога Беларусі».

Трэба асабліва вызначыць работу сярод працоўных жанчын, — стваральны пры КСУ фонды дапамог па абслугоўваньні патрэбаў батрачкі, калгасьніцы, бяднячкі.

Работа па вышуканьні сродкаў на дапамогу дзіцячым установам, дзецям беднякоў і батракоў-школьнікам заставецца і надалей адказьнейшай работай КСУ.

У сваёй рабоце КСУ павінны праўгледзіць ня толькі вытворчую дапамогу калгасам і аднаасобным бядняцкім калгаскам, а і дапамогу на выпадак хваробы, інвалідзнасьці і іншых няшчасьцяў.

КСУ БССР павінны цьвёрда перад сабой паставіць і па-бальшавіцку настойліва выканаць гэтыя важнейшыя задачы.

Партарганізацыі павінны ўзмацніць кіраўніцтва арганізацыямі КСУ, а савецкія, прафэсыянальныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі павінны стаць на шлях бальшавіцкай дапамогі арганізацыям КСУ, якія ня здоледі свае совы выправіць свае недахопы.

Васільлеў.

Ліквідаваць дэмобілізацыйныя настроі слуцкіх КСУ

Слуцкі раённы КСУ зусім слаба ўдзельнічае ў правядзеньні ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Ён абмежаваўся толькі тым, што пераслаў дырэктыву ЦК КСУ аб удзеле КСУ ў правядзеньні ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы і плян гэтай работы па сваёй нізкавой сетцы.

У пляне ўборачнай кампаніі, складзеным раённым КСУ, прадугледжана аб слугоўваць сіламі КСУ па ўборны ўраджаю ня менш 35 калгасаў раёну і ня менш 44 аднаасобных бядняцкіх гаспадарак. Для ажыцьцяўленьня гэтага сельскім КСУ трэба было арганізаваць у дадатак да існуючых працдружын яшчэ па адной дружыне на кожны КСУ, аднак, гэтага зроблена ня было, а РКСУ зусім не паклапаціўся аб тым, каб праверыць выкананьне сваіх дырэктыў.

Старшыня РКСУ за ўвесь час наведаў толькі два самыя бліжэйшыя сельсаветы, ды і то не праверыў там належным чынам выкананьня сельскім КСУ плянаў уборачнай.

Ніводзін КСУ у раёне палец аб палец не ўдарыў для таго, каб дапамагчы калгасам і бядняцкім гаспадаркам у правядзеньні ўборкі ўраджаю. Дзякуючы сваёй бязьдзейнасьці КСУ не змаглі нават арганізаваць уборку сваіх засеваў і сенажацяй і зварочаюцца за дапамогай у гэтым напрамку да калгасаў і саўгасаў, на кажучы ўжо аб дапамозе ва ўборцы зпошнім, якую павінны былі даць працдружыны КСУ.

Так, Ісараўскаму КСУ дапамог убраць 30 коп жыта суседні саўгас, а Прошчыцкаму КСУ уборку зрабіў калгас.

Ня лепш абстаіць справа і ў іншых КСУ.

Замест таго, каб узмацніць існуючыя пры КСУ працдружыны і арганізаваць новыя — у выніку дрэннага кіраўніцтва раённага КСУ нават раней арганізаваныя працдружыны КСУ разваліліся.

Камітэтамі таксама яшчэ не прыступлена да загатовак насеньня патрэбнага да асеньняй сяўбы. Гэтыя загатоўкі павінны прайсьці галоўным чынам за кошт спагнаньня выдадзеных збожжавых пазык і скончыцца да 10 жніўня, аднак, КСУ нічога ня зрабіў для выкананьня гэтага пляну ў тэрмін РКСУ, як відаць, зусім забыўся аб загатоўках і не падштурхвае на гэта сельскія КСУ.

Вялікую ролю павінны адыграць КСУ у дапамозе калгасам і бядняцкім гаспадаркам па стварэньні кармавой базы, прычым у гэтым напрамку асабліва месца ўвагі КСУ павінна зняць сіласная кампанія, аднак, ніводзін КСУ у раёне ў гэтых адносінах нічога не робіць.

Наогул КСУ зусім нічога ня робяць у раёне. Кіраўніцтва імі з боку РайКСУ таксама амаль зусім адсутнічае, як адсутнічае і праверка выкананьня розных заданьняў і плянаў Старшыня РКСУ амаль нікол ня бывае ў сельскіх камітэтах.

Але яшчэ горш абстаіць работа КСУ якія ў сувязі з ліквідацыяй Грэскага раёну далучаны да Слуцкага. Старшыня РКСУ там нікол ня быў і як ён сам гаворыць нават ня ведае, дзе яны знаходзяцца. Такім чынам больш 6 КСУ засталіся зусім бяз кіраўніцтва і нагляду. Між тым работа ў КСУ былога Грэскага раёну зусім адсутнічае.

Трэба рашуча спыніць гэтую сьпячку і бязьдзейнасьць Слуцкага КСУ

А. Курдо

Каморавіцкі КСУ ня ўключыўся ва ўборачную

Каморавіцкі КСУ, Петрыкаўскага раёну, у 1930 годзе выдаў 4.726 кгр. збожжа і 370 кгр. бульбы як насеньпазыку, але да гэтага часу ён не спагнаў ніводнага кілё гэтае пазыкі. Шмат зямлі ў гэтым КСУ засталося незасеянай.

Старшыня КСУ тав. Абрамовіча гэта, аднак, зусім ня турбуе. Ён кажа, што засяваць камітэцкія землі наогул ня трэба, бо «ўсёроўна насеньне забяруць калгасы».

У КСУ ёсьць шмат сельска-гаспадарчага інвэнтара, але гэты інвэнтар весьмі запушчаны і неадрамантаваны.

Ва ўборачнай кампаніі і падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы КСУ ніякага ўдзеля ня прымае.

Хто абудзіць да жыцьця Каморавіцкі КСУ?

Калгасьнік.

Вырваць Інсараўскі КСУ з рук кулакоў

Інсараўскі КСУ Слуцкага раёну зусім падпаў пад кулацкі ўплыў. Нават уся тэхнічная (канцылярская) работа КСУ выконваецца блізкім «сябрам» гэтага КСУ—кулаком Гарбачом.

Старшыня КСУ Капацэвіч зусім зрабіўся кулацкім агентам і ўсю сваю дзейнасьць накіроўвае на карысьць кулацтву. Яна нават адкрыта выступала на сходзе калгасьнікаў супроць абагуленьня кармоў.

Капацэвіч імкнецца давесьці, што ў сельсавеце няма кулакоў. Быў нават такі выпадак, што Капацэвіч пляснула вадой у вочы калгасьніцы тав. Грынюк калі тая даводзіла Капацэвіч, што ў сельсавеце кулакі ёсьць і з імі трэба рашуча змагацца.

Слуцкі раённы КСУ зусім ня цікавіцца работай сельскіх камітэтаў, і гэтую бязьдзейнасьць КСУ выкарыстоўваюць кулакі для сваіх мэтаў.

А. К.

Пра аднаасобны сэктар забыліся

Арганізацыі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі па БССР маюць звыш 1000 пракатных пунктаў с-г машын і 70 кузьняў — майстэрняў для рамонту с-г машын і прылад. У кузьнях КСУ разам з с-г інвэнтаром калгасаў раманцуецца ўласны с-г інвэнтар КСУ і с-г інвэнтар бяднякоў, якія яшчэ ня ўступілі ў калгасы.

На ўсё гэта патрэбна жалеза і апошняе кузьні КСУ звычайна атрымлівалі па лініі НКЗБ. Аднак, на III квартал НКЗБ адмовіў КСУ у выдачы жалеза і прапанаваў: «калі будзеце рэмантаваць інвэнтар калгасаў, дык атрымаеце жалеза па дагаворанасьці з мясцовымі райкалгассаюзамі».

М. П.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР
Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева ХАЛОПКА
Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк
Сёньня дэбют новых артыстых
Лепшы ў СССР атракцыён 4 ЭЛЬВОРЦІ 4
3 Голядзе 3 | Вероніка муз. акробаты
Новая дрэсіроўка А. В. Лапіада
Паветраны палёт ВАЛЕНЦІНІ
2 Сазоновы 2 з першом | Тік-Так акробаты эксцэнтрыкі
Пачатак а 9 гадз. Льготныя білеты ў рабочай касе. Па заяўкам ФЗМК скідка 40 проц

Кіно-тэатр Культура
З 17-га жніўня Ната Вачнадзе і Кторай у карціне ЖАЛЕЗНАЯ БРЫГАДА

Кіно „Інтэрнацыянал"
Ад 15-га жніўня Парыскі шавец Звыш праграмы кіно нарыс № 15 Белдзяржкіно.
Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

Кіно „Пралетары"
З жыцьця Тургенева „АСЯ"
Пачатак а 2, 3-45, Вач. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка"
Сёньня і штодзённа Міс-Мэнд
Пачатак а 7 гадз.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ БУЙНАЙ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ
ПРАЦЯГВАЕ ПРЫЕМ ЗАЯЎ
аб паступленьні ў інстытут на аддзяленьні:
1. Буйнай рагатай жывёлы (рыхтуе спэцыялістаў жывёлаводаў вышэйшай кваліфікацыі для малочных саўгасаў і малочна-таварных калгасных фэрм).
2. Малочнае справы (рыхтуе спэцыялістаў тэхнікаў вышэйшай кваліфікацыі па перапрацоўцы малака ва ўсе віды малочнай прадукцыі).
3. Праводзіць набор на аддзяленьне эканомікі і плянаваньня (рыхтуе спэцыялістых вышэйшай кваліфікацыі эканамістаў плянавікоў у галіне жывёлаводчых гаспадарак).
Тэрмін падачы заяў працягнут да 10 верасьня
Выпыты з 10 па 20 верасьня
Заняткі з 1-га кастрычніка. Заявы падаваць на імя прыймовай камісіі інстытуту буйнай рагатай жывёлы, г. Горкі БССР
ДЫРЭКЦЫЯ

ПРЫЕМ ЗАЯЎ у Гомельскі Агро-Пэдінстытут
на фізыка-тэхнічнае і хэміка-біолёгічнае аддзяленьні, а таксама на польскую групу тых-жа аддзяленьняў
ПРАЦЯГНУТЫ да 15 верасьня
Заявы накіроўваць: Гомель, Пролетарская, 2, канцэлярыі Агро-Пэдінстытуту
ЗАНЯТКІ З НОВЫМ НАБОРАМ ПАЧНУЦЦА З 1-Х—г. г.
ДЫРЭКЦЫЯ

БЕЛАРУСКІ Дзяржаўны Вышэйшы Пэдагагічны Інстытут (рэарганізаваны з пэдфаку БДУ)
абвяшчае асеньні набор студэнтаў
НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ І АДДЗЯЛЕНЬНІ:
I. Сацыяльна-эканамічны факультэт:
а) Аддз. эканомікі 60 асоб, з іх белсэкцыя 30 асоб, яўсэкцыя 30 асоб. Аддзяленьне рыхтуе выкладчыкаў эканамічных дысцыплін у тэхнікумах, рабфаках і ФЗУ.
II. Літаратурна-лінгвістычны факультэт:
а) на аддзяленьне радакцыйна-выдавецкае, якое рыхтуе стыльрэдактараў для выдавецтваў і рэдакцый буйных газэт—прымаецца 30 асоб
III. Пэдалёга-пэдагагічны факультэт:
а) на аддз. пэдалёгічнае, якое рыхтуе выкладчыкаў пэдалёгіі і навуковых працаўнікаў для дасьледчых устаноў—прымаецца 30 асоб.
б) на інспэктарскае аддз., якое рыхтуе інспэктароў Нарасьветы і кіраўнікоў буйных навучальных устаноў—прымаецца 30 асоб.
Заявы з дакумантамі вызначанымі ў даведнику НКА, прымаюцца ў канцэлярыі Пэдінстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, прыродазнаўчы корпус) да 20 жніўня 1931 г. Іспыты для тых тавар шоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Аб тэрміну пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна. Правілы прыёму абвешчаны ў даведнику НКА аб паступленьні ў ВНУ.
Настаўнікі прымаюцца толькі па прадстаўленьні дазволу райінспэктароў Нарасьветы.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі забясьпечваецца 70 п оц. студэнцтва.
Дырэктар Пэдінстытуту В. РУДНІЦКІ

ЧАЧЭРСКІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ТЭХНІКУМ СЬВІНАГАДОЎЛІ
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ на першы курс тэхнікуму
Заявы падаюцца да 10-га верасьня па адрасу: м. Чачэрск (Гомельшчына) сьвінагадоўчаму тэхнікуму.
Да заявы прыкладаюцца ўсе дакуманты, згодна даведніка НКА на 1930-1931 г.
З 10 па 15 верасьня праводзяцца іспыты для асоб, якія ня могуць паступіць у тэхнікум бяз іспытаў.
Студэнты забясьпечваюцца аднолькава з індустрыяльнымі тэхнікумамі.
З няткі пачнуцца 1-га кастрычніка. Асобач, якія будуць залічаны, будзе паведамлена пэрсанальна
Дырэктар Тэхнікуму

АБ'ЯВА
ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЕМ ЗАЯЎ
у Магілеўскі Пэдінстытут на аддзяленьні:
1. Гістарычна-эканамічнае 2. Літаратурна-лінгвістычнае
Умовы прыёму наступныя: бяз іспыту прымаюцца асобы, скончыўшыя рабфакі, рабочыя унівэрсытэты, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, скончыўшыя прафшколы і ФЗВ на базе сямігод і, скончыўшыя пэдтэхнікумы (пасьля 2-хгадовай працы)—2-хгадовыя пэдкурсы, (пасьля трохгадовай працы) 9-цігадовыя школы, агульна-адукацыйныя 2-гадовыя курсы на базе сямігодкі, курсы беларусазнаўства.
Ад іспыту аслабяваюцца, акрамя грамадазнаўства, асобы скончыўшыя былыя настаўніцкія сэмінарыі, настаўніцкія інстытуты, б. 8 клясаў гімназіі, б. рэальныя і камэрцыйныя школы.
Усе іншыя асобы павінны трымаць іспыты за курс Пэдтэхнікуму.
Узрост паступаючых 17—35 год. Большая частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Да заявы павінны быць прыкладзены арыгіналы дакумантаў. Заявы з адбіткамі дакумантаў ня будуць разглядацца.
Заявы прымаюцца да 1 верасьня г. г., іспыты пачнуцца ад 15 да 20-га верасьня. Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка. Заявы накіроўваць па адрасу: Магілеў, Быхаўская, 18, Пэдінстытут.
Дырэктар ВОЛКАЎ

БЕЛАРУСКІ Дзяржаўны-Фінансава-Эканамічны Інстытут
АБВЯШЧАЕ, што падача заяў у Інстытут працягнута да 1 верасьня г. г.
Умовы прыёму гл. у газэце „Сав. Бел." ад 27-VII № 171 і ад 1-VIII № 175
Заявы накіроўваць: гор. Менск, Савецкая, 45, сэктар кадраў НКФ для Фінінстытуту
Дырэкцыя Інстытуту

Нарсуд Горацкага раёну, на падставе прысуду ад 15 сьнежня 1930 г. па арт. 213 КК, абвяшчае гр